КУЛЬТУРА ▸ ГРАМАДСТВА ▸ ЭКАНОМІКА ▸
ЛЮДЗІ ▸ ПАДЗЕІ ▸ ФАКТЫ

◂ № 14 (190)
◂ 16 КРАСАВІКА ◂ 2010 г.
www.novychas.org

# Новы Час



**АНДРЭЙ ЗАВАДСКІ**

Стар. 4

**ДАЙВЕРЫ СУПРАЦЬ ЭКОЛАГАЎ**

У Нацыянальным парку «Нарачанскі» дайверы спрабуюць арганізаваць парк для падводнага плавання. Экологі б'юць трывогу

Стар. 5

**ЯКІ СЦЭНАР ЧАКАЕ КЫРГЫЗСТАН**

Бакіеў нечакана аб'явіўся на поўдні Кыргызстана і ўпарта працягвае лічыць сябе адзіным легітымным кіргізскім кіраўніком

Стар. 11

**ГІТАРЫ СВАБОДЫ**

Стар. 15

**ЧЫТАЙЦЕ Ў НАСТУПНЫМ НУМАРЫ!**

**ХТО АСУШЫЎ ЭЛЕКТАРАЛЬНАЕ БАЛОТА**

Нарыс Сяргея Нікалюка з цыклу «Азбука паліталогіі»

▸ **АД РЭДАКЦЫІ**

# СМУТКУЕМ РАЗАМ З ВАМІ

*Аляксей КАРОЛЬ*

**З 10 красавіка Польшча ў жалобе. Па трагічна загінулых у авіяцыйнай катастрофе па дарозе на Катынь. Жалобе не толькі афіцыйна абвешчанай, але і асабістай, сэрцам успрынятай як свая ўласная бяда ці не кожным палякам.**

Плошча перад Прэзідэнцкім палацам у Варшаве сталася плошчай тысяч знічак і мільёнаў кветак. Сум не на паказ. І слёзы не на публіку. Сцішыўся людскі гоман на вуліцах, не чуваць смеху.

Польшча ў жалобе. Але і ў звычайным працоўным рытме. Ніякіх зрываў, алагічных рашэнняў, нервовай мітусні ва ўсіх сферах палітычнага, эканамічнага і грамадскага жыцця, ва ўсіх галінах і на ўсіх узроўнях улады. Дзяржаўны механізм працуе ў зададзеным рэжыме. Функцыі загінулых узялі на сябе іх намеснікі. Ніякіх палітычных інтрыг і закулісных спроб скарыстацца сітуацыяй. Палітычныя апаненты стаяць побач. Гора і смутак — адны на ўсіх. Перад тварам смерці ўсе роўныя. Перад тварам смерці ў нармальным грамадстве палітыка бярэ паўзу.

Польшча ў жалобе. Здольнасць аб'яднацца, салідарызавацца ў складаныя моманты, у самоце і горы — прыкмета асабістай годнасці кожнага чалавека, аднак і прыкмета сталасці нацыі, адказнасці грамадства. Польшча пасля катастрофы дэманструе, што ў краіне створана і набыла здаровую устойлівасць дэмакратычная палітычная сістэма, сфармавалася палітычная эліта, у наяўнасці адпаведны ўзровень палітычнай культуры насельніцтва.

Польшча ў жалобе. Красавіцкім ранкам у небе над Катынню,



Варшава, каля прэзідэнцкага палацу




Фота Насці Манчавай

Мінск, каля польскай амбасады

здарылася, як сказана ў заяве польскага амбасадара ў Беларусі Хенрыка Літвіна, «адна з найвялікшых трагедый у гісторыі Польшчы». Тыя, хто ляцеў аддаць даніну памяці салдатам у Катыні, самі загінулі ў катынскім лесе.

Канешне, трагічная выпадковасць. Канешне, збег самых розных неспрыяльных абставін. Пра канкрэтныя прычыны скажа следства. Зразумела, што і авіякатастрофы, на вялікі жаль, здараюцца. Усё так. Але і не зусім так.

У гістарычным ланцужку падзей — ад Катыні да Катыні — гэта катастрофа выклікае асацыяцыю са стрэлам сталінскага таталітарнага мінулага ў дэмакратычную сучаснасць. Да трагічнага спісу расстраляных польскіх жаўнераў дадалася яшчэ амаль сотня імёнаў. І якіх — прэзідэнта з жонкай, дэпутатаў, генералаў, журналістаў, навукоўцаў…

У адным самалёце прадстаўнікоў польскай эліты сабрала памяць пра тую даўнюю трагедыю. Памяць, што ёсць абавязковай прышчэпкай ад злавесных наступстваў таталітарызму, ад яго атрутнага ўплыву, нават праз дзесяцігоддзі пасля ўласнай смерці, на свядомасць людзей, на паводзіны эліты, на змест усёй жыццядзейнасці краіны. Палякі гэта ведалі, і таму так упарта дамагаліся праўды аб Катыні і ўшаноўвалі памяць аб трагедыі 1940 года.

Палёт да Катынскага мемарыяла высокай дэлегацыі быў безумоўна палітычнай акцыяй, але акцыяй найвышэйшай маральнай пробы. Гібель дэлегацыі сталася трагічным знакам-напамінам злачыннай сутнасці таталітарных рэжымаў. І знакам-папярэджаннем пра небяспеку іх аднаўлення пад любымі колерамі.

Польшча ў жалобе. А разам з Польшчай смуткуе ўвесь цывілізаваны свет. Нечакана моцная і масавая хваля спачування, як на афіцыйным узроўні, так і, асабліва, ад насельніцтва, што пайшла з Расіі, абнадзейвае, што і яе палітычная эліта ўспрыме катынскую трагедыю як знак канчатковага развітання з таталітарным мінулым, адмовы ад імперскіх традыцый.

Жалоба ў знак салідарнасці была абвешчана ў Еўрасаюзе, Украіне, Сербіі, Расіі. Трохдзённую тугу абвясціла Літва. У дзень пахавання жалоба пройдзе ў Славакіі, Чэхіі, Латвіі, Эстоніі. Нават далёкая Бразілія адрэагавала трохдзённай жалобай.

З суседзяў толькі Беларусь не абвясціла жалобу на афіцыйным узроўні. Фільм Вайды «Катынь», што ішоў па канале «Расія», беларускі глядач не ўбачыў, на «РТР-Беларусь» яго перакрылі шоу «Танцы з зоркамі».

Рэакцыя абсалютна ірацыянальная, нават з пункту погляду іміджу рэжыму і яго лідэра. Як на знешні свет — што на Захад, што на Усход, — так і ў самой Беларусі. Нават у вачах адданага электарату, у вачах саміх чыноўнікаў, з якіх некаторыя нават адважыліся пра гэта крытычна выказацца. Бо не палюдску, не па-суседску. Бо абуджае падазрэнні, што рэжым сапраўды затрымаўся на «лініі Сталіна».

Але, падаецца, няма сэнсу губляцца ў здагадках наконт матываў і прычынаў такой рэакцыі. Як і заклікаць А. Лукашэнку абвясціць жалобу. Навошта? Жалобу абвясціў народ. Людскі паток да польскай амбасады са знічамі і кветкамі, са словамі спачування сведчыць: Беларусь знаходзіцца сярод цывілізаваных еўрапейскіх дзяржаў, якія салідарныя з Польшчай. Па-за гэтае кола паставіў сябе толькі беларускі рэжым. Але, як вядома, уладары прыходзяць і сыходзяць, а народ, краіна застаюцца.

Працяг тэмы на стар. 12–13 ▸

# ФАКТЫ, ПАДЗЕІ, ЛЮДЗІ



## НАВІНЫ РЭГІЁНАЎ

### ВІЦЕБСК. МІТЫНГ УСЁ Ж АДБЫЎСЯ

Улады не дазволілі актывістам грамадзянскай ініцыятывы «Наш дом» правядзенне мітынгу. Аднак 14 красавіка, у міжнародны дзень вызвалення вязняў фашысцкіх канцлагераў, на месцы былога лагера «5-ы полк» мітынг адбыўся. Да помніка былі ўскладзены вянкі, прысутным раздадзены кубкі з сімволікай па ўшанаванню памяці ахвяраў канцлагера, прайшла памінальная служба.

### МАСТЫ. АДНА НАДЗЕЯ НА ЗВАРОТЫ

Нягледзячы на своечасовыя паведамленні грамадзянінам Радзікевічам у аварыйна-дыспетчарскі пункт РУП ЖКГ наконт адсутнасці гарачай вады ў кватэры на працягу лютага, у жыроўцы быў выстаўлены поўны рахунак за яе спажыванне. Пры гэтым, паводле адказаў дыспетчара, сітуацыя з адсутнасцю гарачай вады ў лютым месяцы была выклікана падачай вады з недастатковай тэмпературай ад пастаўшчыка — ААТ «Мастоўдрэў». Дэпутат райсавета Дзмітрый Кухлей зазначае, што за кожны 1°С зніжэння тэмпературы гарачай вады памер аплаты за падагрэў памяншаецца на 2,5 працэнтнага пункта на перыяд прадстаўлення паслугі з недахопамі. Дэпутат скіраваў зварот камунальшчыкам, пасля чаго плата за гарачую ваду была знятая.

### БАРЫСАЎ. ЁСЦЬ У БЕЛАРУСІ СКАЎТЫ

З 10 да 13 красавіка пад Барысавам быў арганізаваны лагер для беларускіх скаўтаў. У ім прынялі ўдзел 27 чалавек, якія прыехалі з Глыбокага, Паставаў, Мінска і іншых мясцовасцяў. Скаўты вучыліся майстраваць з дрэва без дапамогі цвікоў і малатка. Так, напрыклад, яны збудавалі паходны алтар і лагерную мэблю — сталы і лаўкі. Таксама вопытныя інструктары тлумачылі малодшым, як арыентавацца ў мясцовасці, гатаваць простую ежу і запальваць вогнішча з адной запалкі.

Вера ў Бога, імкненне да духоўнай дасканаласці і маральнае жыццё — гэта неад'емныя складнікі моладзевай фармацыі ў скаўтынгу. Таму ў лагеры пад Барысавам частымі гасцямі былі каталіцкія святары. Скаўты мелі магчымасць прыйсці да споведзі і прыняць камунію.

### ДЗІСНА. ЗНОС ПОМНІКАЎ КАНТРАЛЮЕ ЧЫНОЎНІК

У Дзісне, самым маленькім горадзе Беларусі, плануецца знос як мінімум трох камяніц пачатку XX стагоддзя. У тым ліку гарадскога клуба, у якім сто год таму ладзіліся спектаклі «бацькі беларускага тэатра» Ігната Буйніцкага. Пра гэтыя планы чыноўнікаў стала вядома пры асвятленні пытанняў развіцця і добраўпарадкавання горада на старонках абласной дзяржаўнай газеты «Народнае слова». У ёй быў апублікаваны ліст жыхара Дзісны Фадзея Шымуковіча, у якім ён пералічыў праблемы свайго горада, у прыватнасці, надзвычай кепскі стан узведзеных напачатку XX стагоддзя будынкаў былой павятовай бальніцы, казначэйства і гарадскога клуба. Пазней у той жа газеце быў апублікаваны адказ намесніка старшыні аддзела эканомікі Віцебскага аблвыканкама Святаслава Зароўскага. Старыя камяніцы ён залічвае да тых аб'ектаў, якія «спісаныя з уліку некалькі год таму, але не знесеныя з-за адсутнасці сродкаў, патрэбных дзеля разборкі». Чыноўнік запэўніў, што пытанні, звязаныя з добраўпарадкаваннем Дзісны, «знаходзяцца на кантролі ў аблвыканкаме».

### НАВАПОЛАЦК. У ГОНАР ПЕРАМОГІ ПАД ГРУНВАЛЬДАМ

За некалькі дзён сябры суполкі «Рубон» гарадской арганізацыі ТБМ сабралі больш за 100 подпісаў пад зваротам наконт перайменавання адной з вуліц і ўсталявання памятнага знаку да перамогі пад Грунвальдам. Зварот накіраваны ў Полацкі гарвыканкам і гарсавет.

«Мы, жыхары Полаччыны, падтрымліваем апублікаваную ў газеце «Полацкі веснік» (за 26 сакавіка 2010 года, № 24) прапанову годна адзначыць 600-годдзе перамогі пад Грунвальдам, дзе «злучаныя сілы радзімы нашых продкаў — Вялікага княства Літоўскага і Польскага Каралеўства — разграмілі армію Тэўтонскага ордэна. Велізарны ўклад у Грунвальдскую перамогу ўнеслі беларускія харугвы. Полацкая харугва сярод іх была адной з самых вялікіх і добра ўзброеных, бо на той час Полацк з'яўляўся найбуйнейшым і найбагацейшым горадам Вялікага княства Літоўскага. Гэты факт, як і мужнасць полацкіх ваяроў на полі бітвы, шмат разоў адзначаліся ў навуковай гістарычнай літаратуры. Падчас святочных мерапрыемстваў у гонар афіцыйнага прызнання нашага горада культурнай сталіцай краіны пра заслугі палачан у Грунвальдскай перамозе нагадаў міністр культуры Беларусі Павел Латушка. Мы згаджаемся з апублікаванай прапановай надаць адной з полацкіх вуліц назву Грунвальдская, а таксама прапануем усталяваць у Полацку памятны знак у гонар славутай перамогі. Пра ўсталяванне падобнага знаку ў сваім горадзе абвясцілі нядаўна і ўлады горада Віцебск», — гаворыцца ў звароце.



ПАМЯЦЬ

## НЕ СТАЛА ШЧЫРАГА БЕЛАРУСА

**12 красавіка на 92-м годзе пайшоў з жыцця найстарэйшы беларускі святар у эміграцыі айцец Кастусь Маскалік.**



Быў ён святаром усходняга абраду. Дзяцінства і юнацтва айца Кастуся прайшло ў Нясвіжскім раёне. Калі пачалася вайна, Кастусь быў прызваны ў Чырвоную Армію, а потым запісаўся ў войска генерала Андэрса. Прайшоў з войскам увесь Блізкі Усход, на ўсё жыццё запомніўшы даты і дэталі вайсковага паходу таго часу.

Потым, ужо святаром Беларускай Каталіцкай Місіі ў Лондане, айцец Кастусь за якімнебудзь сняданкам мог раптам сказаць: «Сёння 50 гадоў, як я перайшоў Іардан», або, скажам, як увайшоў у Іерусалім. І ганарыўся, што за ўсю вайну не зрабіў аніводнага стрэлу, бо служыў пры кухні.

Па вайне ў рымскім езуіцкім калегіуме Rusicum атрымаў адукацыю ды быў высвячаны на святара. Працаваў у розных краінах — то чытаў па-беларуску навіны на ватыканскім радыё, то ўзначальваў беларускую каталіцкую місію ў Парыжы. Але найбольш часу пражыў у Лондане.

СПРАВА

## ГРОШЫ НА ШКОЛУ ЗНАЙШЛІСЯ

**Магілёўскі гарадскі выканаўчы камітэт выдаткуе суму ў памеры 57,6 мільёна рублёў на рамонт даха школы № 26.**

Рамонтныя працы будуць выкананы да 1 верасня 2010 года. Такі адказ атрымаў грамадскі актывіст Аляксей Паўлоўскі ад намесніка старшыні Магілёўскага гарвыканкама Фёдара Міхеенкі.

У лісце сказана, што яшчэ ў 2009 годзе спецыялісты аддзела адукацыі адміністрацыі Ленінскага раёна сумесна з адміністрацыяй школы пры правядзенні планавага вясенняга агляду школы вызначылі неабходнасць у рамонце даха СШ №26, але ў сувязі з адсутнасцю запланаваных бюджэтных сродкаў у жніўні 2009 года за кошт пазабюджэтных сродкаў быў здзейснены частковы рамонт даха, у месцах зацякання дажджавой вады. Працы па рамонту даху былі ўключаны ў план рамонтных работ на 2010 год.

Аляксей Паўлоўскі лічыць, што калі б не калектыўны зварот бацькоў з нагоды гэтай праблемы, то невядома, калі б мясцовыя ўлады адрамантавалі школьны дах.

«Я вельмі часта атрымліваю розныя адказы ад прадстаўнікоў мясцовай улады, — гаворыць Аляксей Паўлоўскі. — Там, дзе людзі іх вымушаюць нешта зрабіць, яны робяць выгляд, што ўсё робіцца і без нас, а ўлада і так ведае, што трэба рабіць, і клапоціцца пра нас».

Справа ў тым, што месяц таму 20 бацькоў школы № 26 звярнуліся да Аляксандра Лукашэнкі з адкрытым лістом. У лісце бацькі патрабавалі вырашыць праблему з рамонтам сярэдняй школы, у якой вучацца іх дзеці. У выпадку невыканкія іх патрабавання яны адмаўляліся ісці на выбары ў мясцовыя саветы дэпутатаў.

## ВЫБАРЫ

### ШТРАФ ЗА СТЫПЕНДЫЮ

**Сябра Маладога Фронту Зміцер Ясевіч, які балатуецца ў мясцовыя Саветы па выбарчай акрузе № 3 Мінска ад кааліцыі «Новае Пакаленне», атрымаў штраф за неаплачаныя падаткі са стыпендыі.**

Зміцер Ясевіч навучаецца ў Еўрапейскім гуманітарным універсітэце на 4-м курсе факультэта «Паліталогія». Падаючы дакументы для рэгістрацыі кандыдатам у мясцовыя саветы, Зміцер у дэкларацыі аб прыбытках пазначыў наяўнасць стыпендыі. Падатковая інспекцыя Заводскага раёна Мінску палічыла наяўнасць стыпендыі, неабкладзенай беларускім падаткам, злачынствам і прызначыла Ясевічу штраф у памеры 43750 рублёў, а таксама паставіла перад абавязкам сплаціць 864000 рублёў за атрыманыя за мяжой прыбыткі.

«Натуральна, такое галавацяпства ў дзяржаўных інстытутах абурае, — гаворыць Зміцер Ясевіч. — Паводле заканадаўства, стыпендыя не абкладаецца падаткамі. Таму я планую аспрэчваць рашэнне падатковай Заводскага раёна ў вышэйшых інстанцыях».

### СЕМ ГАДЗІН НА МЯЖЫ

**11 красавіка 2010 года на беларуска-літоўскай мяжы на сем гадзінаў былі затрыманыя ўдзельнікі магістэрскай праграмы «Публічная палітыка» ЕГУ Алесь Зарэмбюк і Андрэй Цалко, якія ехалі з вучобы дахаты на машыне Зарэмбюка.**

Начальнік заставы Сяргей Карабач паведаміў, што ўсіх адпусцяць толькі па дазволу «зверху». Памежнікі выдумлялі розныя прычыны, каб як мага даўжэй пратрымаць хлопцаў. Спачатку паведамілі, што польская віза ў пашпарце Зарэмбюка можа быць падробленай, затым доўга аглядалі машыну на прадмет правозу незаконных рэчаў (іх там, вядома, не апынулася).

У Андрэя Цалко забралі ноўтбук (быццам для экспертызы КДБ), у Алеся Зарэмбюка — картку памяці з фотаапарата. Відавочна, што прычына такіх паводзін памежнікаў — у балатаванні Зарэмбюка на мясцовых выбарах у Беларусі.

### ВЫКРАЛІ ЎЛАСНЫ АЎТАМАБІЛЬ

**У ноч з 7 на 8 красавіка былая дэпутатка Віцебскага гарадскога Савета дэпутатаў 24-га склікання Вольга Карач з мужам Алегам Баршчэўскім былі затрыманыя ў асабістым аўтамабілі работнікамі ДАІ па падазрэнні ва выкраданні.**

Вольга Карач, кіраўнік Віцебскага абласнога аддзялення АГП, балатуецца ў дэпутаты Віцебскага гарадскога і Віцебскага абласнога Саветаў дэпутатаў 26-га склікання. Да таго ж, яна з'яўляецца адным з каардынатараў сацыяльнай кампаніі «Наш дом» і сузаснавальніцай гарадской незалежнай газеты «Віцебскі кур'ер».

Пасля затрымання Вольгу з мужам даставілі ў Першамайскае аддзяленне міліцыі Віцебска для высвятлення абставінаў справы. Допыт затрыманых працягваўся каля трох гадзінаў і скончыўся а 3-й гадзіне ночы.

Пасля допыту адбыўся дагляд аўтамабіля, у якім супрацоўнікамі міліцыі былі знойдзеныя тры дзесяткі газеты «Віцебскі кур'ер», некалькі асобнікаў незарэгістраванага бюлетэню «Наш дом» і іншых друкаваных матэрыялаў, якія тычацца гэтай кампаніі. Па факце незаконнага распаўсюду друкаваных выданняў на ўладальніка аўтамабіля Алега Баршчэўскага быў складзены адміністратыўны пратакол, пасля чаго затрыманыя былі нарэшце адпушчаныя. На развітанне супрацоўнікі міліцыі сказалі, што пратакол будзе перададзены ў суд, і суддзя прызначыць дату працэсу.

**Паводле інфармацыі кампаніі «Гавары праўду»**

## ТЫДНЁВЫ АГЛЯД

# ЗБРОЯ, БЫВАЙ?

Сяргей САЛАЎЁЎ

**Беларусы адгулялі чатыры дні Радаўніцы. Для кагосьці гэта былі прыемныя клопаты. А некаму такі працяглы адпачынак яўна не пайшоў на карысць.**




Вывад з Беларусі ядзернай зброі быў вельмі жорсткай памылкай. Пра гэта заявіў журналістам Аляксандр Лукашэнка 14 красавіка ў ходзе рабочай паездкі ў Гомельскую вобласць.

«Я лічу, што вывад з Беларусі ядзернай зброі на тых умовах, як гэта было ажыццёўлена нашымі нацыяналістамі і Шушкевічам, гэта было вельмі жорсткай памылкай. Мне яшчэ давялося падпісваць гэты дагавор, таму што дзецца было няма куды: на мяне націскалі і Расія, і амерыканцы — выводзьце, выводзьце, таму што паабяцалі. Нельга было, гэта найвялікшы здабытак, гэта дарагі тавар, які мы ўрэшце павінны былі добра прадаць», — прыводзіць словы Лукашэнкі тэлеканал СТВ.

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што Беларусь вывела ядзерную зброю пад гарантыі бяспекі з боку вядучых ядзерных дзяржаў. «Цяпер нам і гэтай бяспекі не гарантавалі, і мы дабіваліся яе праз пот і кроў. Мы ж вывелі гэту зброю! Калі б у нас была гэта зброя, з намі б цяпер па-іншаму размаўлялі. Добра, вывелі. Дык гарантуйце нам бяспеку. Не», — растлумачыў сваю пазіцыю Лукашэнка.

Пры гэтым ён адзначыў, што ў Беларусі застаўся высокаабагачаны ўран, сотні кілаграмаў фактычна зброевага і менш абагачанага. «Мне ўжо які год запар гавораць: вывозьце гэты ўран. Хочаце — у Амерыку, мы вам заплацім, хочаце — у Расію. Я кажу: «Па-першае, чаму вы нам дыктуеце? Гэта наш тавар, мы яго трымаем пад кантролем МАГАТЭ. Мы не збіраемся рабіць брудныя бомбы ці камусьці прадаваць. Мы выкарыстоўваем гэты ўран у даследчых мэтах». Мяне цяпер прыперлі да сценкі, нож да горла — аддай. Я кажу, што ўжо аддалі ў свой час ядзерную зброю, а што мы ад гэтага маем?» — заявіў прэзідэнт.

Зразумела, такі «тавар», як ядзерная зброя, вельмі дорага каштуе. З іншага боку, Лукашэнка нарэшце ўзгадаў пра абавязкі Расіі і Амерыкі лічыцца з суверэнітэтам Беларусі. Але такія заявы ў той час, калі нам, здаецца, ніхто не пагражае, могуць паставіць краіну ў адзін шэраг з Паўночнай Карэяй, Іранам і іншымі распрацоўнікамі «мірнага атаму». Тым больш, што даўно вядома: «мірнага атаму» не бывае. Затое санкцыі за распрацоўку ядзернай зброі — цалкам канкрэтныя і адчувальныя.

З іншага боку, перад нашым народам прэзідэнт зноў паставіў глабальныя задачы. Экспарт беларускай сельгаспрадукцыі ў наступнай пяцігодцы павінен быць павялічаны ў 2,5 разы, заявіў Аляксандр Лукашэнка, наведваючы 13 красавіка Брэсцкую вобласць.

«Сёлета ў нас будзе экспарт сельгаспрадукцыі пад 3 мільярда долараў. І гэта толькі пачатак, — прыводзіць словы Лукашэнкі яго прэс-служба. — Неўзабаве мы павінны выйсці на 6–7 мільярдаў, а потым і на 10 мільярдаў. Гэта для нас дасягальна. І тады нам не трэба будзе стагнаць аб нафце і газе».

Гэта нагадвае анекдот яшчэ савецкіх часоў: «Як можна слану зарабіць грыжу? Трэба прымусіць яго падняць сельскую гаспадарку». Цікава, як у нас будзе экспарт прадукцыі на 6–7 мільярдаў долараў, а ў перспектыве і 10 мільярдаў? Няўжо ўсе ўжо забыліся на цукровыя, малочныя, мясныя войны з Расіяй? А акрамя Расіі нашая прадукцыя наўрад ці каму патрэбная. Вядома, што ў той да Польшчы сваё мяса ёсць, і пры гэтым значна танней і якасней за беларускае. Здаецца, Лукашэнка выдае пажаданае за дзейснае.

Тым часам працягваецца змаганне за аўтамабілі. У Цэнтрвыбаркам 14 сакавіка перададзены дакументы на рэгістрацыю ініцыятыўнай групы па правядзенні рэферэндуму супраць павелічэння мытных пошлін на аўтамабілі. Ініцыятарам выступіла Партыя БНФ. На рэферэндум выносіцца пытанне: «Ці падтрымліваеце вы захаванне памеру мытных пошлін на ўвоз у Рэспубліку Беларусь легкавых аўтамабіляў замежнай вытворчасці на ўзроўні 26 лістапада 2009 года?»

На працягу месяца Цэнтрвыбаркам павінен праверыць законнасць стварэння ініцыятыўнай групы і прыняць рашэнне адносна яе рэгістрацыі. Рашэнне ЦВК будзе выносіць з улікам заключэння Міністэрства юстыцыі аб тым, ці можа гэта пытанне разглядацца на рэспубліканскім рэферэндуме.

У выпадку рэгістрацыі ініцыятыўнай групы рэферэндум можа прайсці ў чэрвені 2010 года.

У кіраўніцтве партыі лічаць, што пагадненне наконт стварэння Мытнага саюза, падпісанае 27 лістапада 2009 года ў Мінску кіраўнікамі Беларусі, Казахстана і Расіі, «ігнаруе інтарэсы значнай часткі грамадзян Беларусі, для якіх ухаджэнне ў сілу падпісаных дакументаў пацягне пагаршэнне асабістага матэрыяльнага дабрабыту ў сувязі са значным павышэннем мытных тарыфаў і, адпаведна, цэн на важныя катэгорыі тавараў, у прыватнасці на легкавыя аўтамабілі».

Раней Януковіч заявіў, што ініцыятыўная група зможа сабраць больш за мільён подпісаў грамадзян у падтрымку рэферэндуму, а не толькі неабходныя паводле закону 450 тысяч.

І яшчэ нехта зарання прагнуўся пад уладу. Тым часам, калі ніякія дакументы па кантролі за сеткай інтэрнэт у Беларусі не распрацаваныя, беларускія правайдэры ўжо гатовыя кантраляваць трафік інтэрнэт-карыстальнікаў. Прынамсі кампанія «Альтэрнатыўная лічбавая сетка» (брэнды «Атлант Тэлекам» і «Шпаркі дамавік») гатова аказваць паслугі сваім кліентам па фільтрацыі інтэрнэт-трафіку ўжо цяпер. Пра гэта паведаміў 14 красавіка на прэс-канферэнцыі ў Мінску генеральны дырэктар ЗП «Альтэрнатыўная лічбавая сетка» («АЛС») Ігар Сукач.

Патрабаванні фільтрацыі сеткавага трафіку па запыце абанентаў інтэрнэт-правайдэры павінны будуць здзяйсняць з 1 ліпеня ў мэтах выканання ўказа прэзідэнта № 60 «Аб мерах па ўдасканаленні выкарыстання нацыянальнага сегмента сеткі інтэрнэт».

Аднак, як заявіў Сукач, «Атлант Тэлекам» гатовы ажыццяўляць блакаванне непажаданага кантэнту па заяўцы карыстальнікаў дзякуючы ўкараненню праграмных рашэнняў аднаго з найбуйнейшых расійскіх распрацоўшчыкаў антывірусаў кампаніі Dr.Web.

Цікава, колькі абанентаў у гэтым выпадку сыдуць з «Атланта»?



## ФІГУРЫ ТЫДНЯ

### АНДРЭЙ АРАМНАЎ




Беларус Андрэй Арамнаў заваяваў «золата» 89-га мужчынскага чэмпіянату Еўропы па цяжкой атлетыцы. Спартовец упершыню ў кар'еры стаў пераможцам кантынентальнага першынства. Па суме двух практыкаванняў у катэгорыі да 105 кг Андрэй падняў 420 кг (195+225). «Срэбра» ў расіяніна Дзмітрыя Клокава — 409 кг (185+224), «бронза» ў расіяніна Уладзіміра Смарчкова — 408 кг (193+215).

Андрэй Арамнаў пасля перамогі расказаў, што хацеў бы пазмагацца за сусветныя рэкорды. «Я першы раз заваяваў «золата» чэмпіянату Еўропы. Медалі пойдуць у маю калекцыю — яны зробяць яе поўнай. Хацелася б устанавіць некалькі сусветных рэкордаў, але крыху не хапіла сіл. Роў балельшчыкаў злёгку збіваў… Аднак самае галоўнае, што сёння я выйграў і абараніў тытул самага моцнага на Зямлі ў сваёй катэгорыі. Гэта мой дзень». Усяго ў жаночым і мужчынскім спаборніцтвах, якія праходзілі ў Мінску, узялі ўдзел каля 300 спартоўцаў з 37 краінаў.

У капілцы перамог Андрэя Арамнава — золата Чэмпіянату свету па цяжкой атлетыцы 2007 года і Алімпіяды–2008. Апроч дасягненняў у спорце, Андрэй праславіўся і аматарствам кіраваць аўтамабілем у нецвярозым стане — вядомыя два выпадкі, калі супрацоўнікі ДАІ затрымлівалі асілка за гэта парушэнне.

### АЛЯКСАНДР КАНАНОВІЧ



У пракат выйшаў фільм «Дастыш фантастыш» Аляксандра Кананавіча — маладога беларускага рэжысёра, выпускніка курсу Міхаіла Пташука. На «Беларусьфільме» стужку вызначылі як эксцэнтрычную камедыю, а рэжысёр ахрысціў яе кінаістэрыкай. Кананович расказаў, што аўтары фільма выкарыстоўвалі новую для «Беларусьфільма» методыку: «Метад выключэння — яшчэ Жан-Люк Гадар працаваў такім чынам. Ён браў фільм і выразаў непатрэбныя кавалкі, горшае. Часам у гэтым не было логікі, але ўсё ж… Мы паспрабавалі зрабіць тое ж самае. Пасля некаторыя кавалкі нас прасілі выразаць, але я гэтага не зрабіў. Гэта значыць, глядач убачыць 99 працэнтаў майго фільма. А пра адзін працэнт распавяду пазней. Калі-небудзь…»

Дзея фільма адбываецца ў вёсцы «375-ы кіламетр» — там жывуць энергічныя і вынаходлівыя людзі, з якімі здараюцца розныя эксцэнтрычныя гісторыі. Ёсць у сюжэце і лінія кахання, рэўнасці... і ўрэшце здзяйснення цуда.

Прэм'ерны паказ фільма «Дастыш фантастыш» пачаўся 16 красавіка ў 17.00 ва ўсіх галоўных кінатэатрах абласных гарадоў Беларусі. Таксама Беларусьфільм падпісаў дамовы з беларускімі тэлеканаламі аб тэлетрансляцыі кінастужкі, падпісаная і дамова аб рэалізацыі фільма ў Расіі. Наваўвядзеннем будзе выпуск DVD-версіі фільма, набыць якую можна будзе ў крамах кампаніі «Вігма» ўжо з 1 мая.

### УЛАДЗІМІР ЦЮХАЙ



У дэпутаты Мінгарсавета балатуецца Уладзімір Цюхай — сябра БРСМ і КПБ. Вядомы ён тым, што ў 2008 годзе падчас суду над Аляксандрам Баразенкам (адзін з фігурантаў «справы чатырнаццаці», якога абвінавачвалі ў арганізацыі «масавых беспарадкаў» падчас пратэсту індывідуальных прадпрымальнікаў у студзені 2008-га) ударыў і зняважыў маці палітвязня. У адзін з дзён разгляду справы Цюхай прывёў у Цэнтральны суд Мінска каля 30 студэнтаў, у выніку ў зал пасяджэнняў не змаглі патрапіць праваабаронцы, знаёмыя Аляксандра. Калі маці — Алена Баразенка — спытала ў кіраўніка групы студэнтаў, якія занялі ўсю залу суда, ці мае ён сумленне, Цюхай у адказ моцна пхнуў жанчыну ў плечы, а пасля яшчэ і абазваў яе «жывёлінай».

Таксама падчас згаданага судовага працэсу Уладзімір Цюхай адзначыўся тым, што перашкаджаў працы журналіста, спрабуючы вырваць у яго з рук фотаапарат. Свае памкненні міліцыянту, які сачыў за парадкам у судзе, Цюхай патлумачыў так: «Трэба забраць у яго (журналіста) фотаапарат і, перш за ўсё, знішчыць відэазапіс. Калі ён з'явіцца ў інтэрнэце, будзе вялікі скандал!»

ЭКСПЕРТЫЗА

# САМАКІРАВАННЮ ЯШЧЭ ТРЭБА ВУЧЫЦЦА

**Выбарчая кампанія ў мясцовыя саветы ў актыўнай стадыі. Але калі правесці на вуліцы апытанне мінакоў, то выявіцца, што далёка не кожны ведае не тое што кандыдатаў у дэпутаты, але і дату саміх выбараў. Чаму? Адказ на гэта пытанне спрабуе даць адмыслоўца ў галіне мясцовага самакіравання Андрэй Завадскі ў размове з Вольгай Хвоін.**

***— Вы не першы год назіраеце за ходам электаральных кампаній. Як бы вы ацанілі сёлетні ўзровень?***

— Ён выклікае занепакоенасць. Тыя людзі, якія зарэгістраваныя кандыдатамі ў дэпутаты, прадстаўляюць розныя сацыяльныя, палітычныя і прафесійныя групы грамадства. І кожнай групе ўласцівыя свае «радзімыя плямы». Тыя, хто прадстаўляе дырэктарскі корпус, з'яўляецца службовай асобай, ведаюць існуючае заканадаўства, але ўспрымаюць яго некрытычна. Лічаць, што ўсё ў ім добра, і сістэма працуе стабільна. Але гэта памылка, бо наша заканадаўства моцна адрозніваецца ад заканадаўства еўрапейскіх краін і не адпавядае Еўрапейскай хартыі мясцовага самакіравання. Таму ў нашым мясцовым самакіраванні немагчыма эфектыўна працаваць. Такія дэпутаты не змогуць нармальна вырашаць праблемы грамадзян і ўвогуле не разумеюць, што такое самакіраванне ў еўрапейскім кантэксце.

Прадстаўнікі палітпартый, грамадскіх арганізацый ідуць збольшага на пратэстнай хвалі і часам маюць вельмі цьмянае ўяўленне аб дзеючым заканадаўстве і прынцыпах, паводле якіх яно мусіць быць рэфармавана. Таму эфектыўнасць працы такіх дэпутатаў таксама будзе нізкая.

Гэту сітуацыю можна змяніць, і варта тое рабіць. Але для гэтага патрэбны час. Безумоўна, не 30 дзён, якія адпушчаныя на перадвыбарчую кампанію. Мусіць быць адукацыйная, падрыхтоўчая праца. І весці яе трэба не саматужным чынам, а афіцыйна, з удзелам структур мясцовых саветаў, палітычных партый і недзяржаўных арганізацый. Навошта патрэбная афіцыйная падтрымка? Каб людзі, якія прадстаўляюць дзяржаўныя, уладныя структуры, асэнсавалі, што і ім неабходна авалодваць ведамі, што гэта ўмова эфектыўнай працы мясцовых саветаў дэпутатаў.

Для выбарцаў важная не столькі здольнасць кандыдата перамагчы ў кампаніі, колькі яго ўменне на пасадзе дэпутата вырашаць праблемы.

***— Чаго не хапае кандыдатам у дэпутаты, каб якасна правесці сваю кампанію ды заваяваць сэрцы і розумы выбарцаў акругі?***

— Прынцыпова не хапае грунтоўных ведаў дзеючага заканадаўства. Не столькі выбарчага характару, колькі заканадаўства, якое рэгулюе яго далейшую працу на выбарнай пасадзе, а менавіта — законаў аб мясцовым кіраванні і самакіраванні, аб статусе дэпутата мясцовага савета, аб масавых мерапрыемствах, аб рэспубліканскіх мясцовых сходах, аб зваротах грамадзян. Апроч таго кандыдатам бракуе магчымасцяў выхаду да людзей праз арганізацыю сустрэч і праз СМІ. Тыя магчымасці, якія сёння дае



інтэрнэт як новы канал сувязі, выкарыстоўваецца не на 100 працэнтаў. Бо карыстальнікамі збольшага з'яўляюцца спецыфічныя прафесійная і ўзроставая групы. А пераважная большасць выбарцаў усё ж знаходзіцца пад уплывам традыцыйных сродкаў масавай інфармацыі — тэлебачання, газет, радыё. Яны ж не ставяць сабе на мэце паўнавартасна асвятляць выбарчай кампанію і растлумачваць пазіцыю канкрэтнага кандыдата.

***— У гэтым і прычына апатыі грамадства да выбарчага працэсу ў цэлым?***

— Апатыя не ўзнікла сёння, а існуе шмат год. І вынікае яна з таго, што нашы грамадзяне слаба падрыхтаваныя ў разуменні, чым мясцовая ўлада адрозніваецца ад дзяржаўнай. Яны лічаць (і ў большасці выпадкаў робяць правільныя высновы), што ў Беларусі мясцовай улады фактычна няма, бо цэнтральныя органы ўлады сваімі рашэннямі, кіруючымі дзеяннямі, згодна з заканадаўствам, могуць умешвацца ў рашэнні, у дзейнасць і вынікі працы мясцовых саветаў. Гэта недапушчальна з еўрапейскага погляду. Часта выбарцы лічаць, што дзяржаўная ўлада ў выглядзе сваіх рэспубліканскіх органаў з'яўляецца адзінай дзеяздольнай сілай. І з большай ахвотай звяртаюцца ў структуры прэзідэнцкай адміністрацыі, чым да мясцовых уладаў.

Людзі часта не разумеюць розніцу паміж саветам дэпутатаў і выканкамам. Па сваіх праблемах калі ім і даводзіцца звяртацца да мясцовых уладаў, то прыходзяць менавіта ў выканкам. А ён, у сваю чаргу, рэальна вызначае ўмовы жыцця на канкрэтнай тэрыторыі. Менавіта таму і назіраецца апатыя да выбараў асобаў, большасць з якіх у наступныя чатыры гады выбарцы і не пабачаць. Больш таго, выканкамы па сутнасці правакуюць, дэманструючы, што грамадзянам не варта спадзявацца на саветы, якія рэальна не робяць карысных спраў выбарцам.

***— Можа, варта было б плаціць зарплату за працу дэпутата? У людзей быў бы стымул пацікавіцца, за што дэпутат атрымлівае грошы...***

— Калі б дэпутаты мясцовых саветаў працавалі на вызваленай аснове, то іх работа была б больш эфектыўнай. Але ці зацікаўленая дзяржава ў эфектыўнай працы дэпутатаў мясцовых саветаў? Ці не праяўляецца з боку цэнтральных структур улады і выканкамаў на мясцовым узроўні апасенне, што дэпутаты, якія працуюць на вызваленай аснове, у сваёй працы будуць канкураваць са структурамі вертыкалі? Закон аб мясцовым кіраванні і самакіраванні, закон аб статусе дэпутата мясцовага савета прадугледжваюць, што дэпутат, якія працуе на вызваленай аснове, а сёння гэта толькі старшыні саветаў, пасля сканчэння сваіх паўнамоцтваў мусіць ці вярнуцца на старую працу, ці атрымаць раўнацэнную ёй. І тое і другое — рэалізаваць няпроста нават адносна да невялікай колькасці старшынь саветаў. Што ж гаварыць, калі колькасць вызваленых дэпутатаў павялічыцца ў разы. Тым не менш закон і сёння прадугледжвае, што працу сваю дэпутат павінен выконваць адказна. Прынамсі кожны дэпутат не менш аднаго разу на месяц мусіць прымаць сваіх выбарцаў і не менш двух разоў на год рабіць перад імі справаздачу аб сваёй дзейнасці. За парушэнне гэтых абавязкаў выбарцы могуць ініцыяваць працэдуру адклікання дэпутата. Але, на жаль, беларуская палітычная гісторыя не ведае ніводнага такога выпадку. Найперш таму, што працэдура, замацаваная ў выбарчым кодэксе, вельмі складаная і неўнармаваная з фінансавага пункту гледжішча, а таксама разлічаная на вельмі высокую актыўнасць грамадзян, якой мы не бачым. За межамі Беларусі працэдура адклікання амаль не сустракаецца, а ацэнка эфектыўнасці працы дэпутата робіцца падчас наступных выбараў.

САМАКІРАВАННЕ

# КАНДЫДАТ У ДЭПУТАТЫ ЗАРАЗ БОЛЬШ ДАСВЕДЧАНЫ

**Чаму дасведчаныя ў мясцовым самакіраванні асобы ігнаруюць сёлетнія выбары і куды накіроўваюць свае веды ў час выбарчых кампаній? Пра гэта Вольга Хвоін гутарыць з былым дэпутатам Мінскага гарсавета (1990–1996), а таксама сябрам праўлення Фонду імя Льва Сапегі Аляксандрам Жучковым.**



— Я балатаваўся на мінулых выбарах. Разам са мной па акрузе ў выбарах удзельнічаў і сябра партыі БНФ Юрась Карэтнікаў — малады і актыўны чалавек. Які вынік галасавання ёсць насамрэч, цяжка сказаць, але яго тады паставілі на другое месца. Сёлета ён зноў балатуецца па ўчастку, дзе я жыву. І я вырашыў, што лепш правяду навучанне для маладых людзей, якія вылучаліся ў кандыдаты ў дэпутаты па ўсіх рэгіёнах Беларусі, падзялюся сваім досведам і ведамі. Агулам па краіне было прыкладна восем такіх сустрэч.

***— І які ўзровень падрыхтаванасці цяперашніх кандыдатаў?***

— Розны. Канешне, ёсць тыя, хто мае нейкі досвед, а ёсць і з мінімальнымі ведамі. Узровень мінскіх дэпутатаў мне спадабаўся — дасведчаныя людзі, ведаюць, чаго хочуць. У рэгіёнах больш разнамасная публіка. Але нельга патрабаваць высокага ўзроўню падрыхтоўкі кандыдатаў, калі агульная маса людзей мае невялікія паліталагічныя веды, адукацыю ў гэтай сферы. Хаця, калі параўноўваць наш узровень у 1990 годзе — тады мы насамрэч мала што ведалі — і цяперашніх кандыдатаў, то ў асноўнай масе яны вышэй за нас. Усё ж многія атрымалі адпаведную адукацыю, былі на стажыроўках за мяжою, ведаюць, што такое самакіраванне ўвогуле, якія яны маюць правы і магчымасці ў яго межах.

***— Веды — адно, але магчымасці — зусім іншае. Ці мае абраны дэпутат дзейсныя інструменты, мажлівасці, каб рэалізаваць на практыцы тое, што абяцаў сваім выбарцам?***

— Любы дэпутат мае магчымасць выканаць тое, што абяцаў сваім выбарцам. Прынамсі ён мусіць да гэтага імкнуцца. Канешне, перадвыбарчая праграма можа быць крыху папулісцкая, разлічаная на кампанію, завабліванне галасоў. Але заўжды трэба сыходзіць з інтарэсаў выбарцаў сваёй акругі і суседніх. Нават той урэзаны закон аб мясцовым самакіраванні дазваляе актыўнаму дэпутату вырашаць многія праблемы. За сем гадоў маёй працы дэпутатам Мінскага гарадскога савета было прынятае рашэнне аб бясплатных сняданках у школе. Таксама Мінгарсавет памяняў план развіцця горада не ў бок Шабаноў, а на Захад і Паўднёвы Захад, дзе менш выкідаў ад прамысловых прадпрыемстваў. Але ў той час выканкам быў у падпарадкаванні савета. Цяпер, каб мясцовае самакіраванне займела паўнавартасныя магчымасці, не хапае толькі палітычнай волі кіраўніцтва краіны. Нашы суседзі даўно перайшлі да агульнаеўрапейскай сістэмы кіравання, падпісалі Еўрапейскую хартыю мясцовага самакіравання.

***— Але ж ёсць і інструменты, якія абсалютна не працуюць у мясцовым самакіраванні Беларусі... Напрыклад, правядзенне рэферэндуму.***

— У Маларыцкім раёне быў прэцэдэнт, калі паспрабавалі правесці мясцовы рэферэндум супраць будаўніцтва магільніка з ядзернымі адходамі. Але поспеху тая ініцыятыва не мела. Увогуле, працэдура арганізацыі рэферэндуму вельмі складана абстаўленая. Цяпер партыя БНФ хоча дамагчыся правядзення рэспубліканскага рэферэндуму па пытанні захавання памеру мытных пошлін на ўвоз у Рэспубліку Беларусь легкавых аўтамабіляў замежнай вытворчасці на ўзроўні 26 лістапада 2009 года. У Цэнтральную выбарчую камісію быў пададзены поўны пакет дакументаў для рэгістрацыі ініцыятыўнай групы па правядзенні рэферэндуму. Рашэнне ЦВК мусіць прыняць цягам месяца. Паглядзім, што з гэтага атрымаецца, але я ведаю шмат юрыдычных момантаў, якія цяжка прайсці пры правядзенні агульнарэспубліканскага рэферэндуму.

Вельмі складана правесці і сход грамадзян, трэба прасіць у выканкаме адпаведны дазвол. Напрыклад, здараецца нейкая экстранная сітуацыя, і трэба аператыўна прыняць рашэнне аб выдзяленні грошай на аднаўленне дарогі, моста і г. д. Дык вось я не ведаю практыкі, каб дэпутаты абмяркоўвалі ў такіх выпадках са сваімі выбарцамі магчымыя варыянты дзеянняў, перш чым яны будуць прынятыя саветам. Тое, што прымаюць саветы сёння, — гэта збольшага зацвярджэнне рашэнняў выканкама.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

# ДАЙВЕРЫ СУПРАЦЬ ЭКАЛАГАЎ

Марыя КРУК

**У Нацыянальным парку «Нарачанскі» дайверы спрабуюць арганізаваць адмысловы парк для падводнага плавання. Экалагі б'юць трывогу і папярэджваюць, што задума з'яўляецца «мінай запаволенага дзеяння».**



Возера Рудакова



Канфлікт выліўся ў медыйную сферу пасля таго, як у возеры Рудакова, што ўваходзіць у сістэму азёр Нацыянальнага парку «Нарачанскі», затапілі корпус верталёта МІ–2. Арганізатары патлумачылі, што такім чынам ствараецца «падводны парк для апусканняў з аквалангам падводных турыстаў і гасцей краіны, якія захапляюцца дайвінгам».

Аўтар праекта, інструктар па дайвінгу Алег Карцаў расказаў, што ідэя з верталётам узнікла пяць гадоў таму. І сёлетняй зімой у пасёлку Нарач падчас нарады па абмеркаванні праекта Дзяржаўнай праграмы развіцця Нарачанскага курортнага рэгіёну на 2011–2015 гады дайверы прапанавалі стварыць падводны парк для апусканняў з аквалангам на возеры Рудакова.

«Нам далі дабро, каб мы зрабілі цікавую мясціну для пагружэння не толькі беларускіх аквалангістаў, але і гасцей рэспублікі, бо ва ўсім свеце дайвінг вельмі папулярны, — тлумачыць выбар возера Алег Карцаў. — Мы ныралі ў большасці беларускіх азёр — спецыяльна шукалі самае прыгожае для аквалангістаў. У Рудакове найлепшыя ўмовы для пагружэння з аквалангам: вялікая празрыстасць вады, самы прыгожы рэльеф дна, многа водарасцей, рыбы. Гэта вялікі прыродны акварыўм. Так што для нас Рудакова — гэта эталонны вадаём. А цяпер яшчэ і знакавае возера. У нас ёсць першы «wreck», як гэта ў дайвінгу называюць. З цягам часу фюзеляж верталёта стане «падводным рыфам», прыцягне ўвагу не толькі рыб, якія яго з задавальненнем заселяць, але і аквалангістаў з Беларусі ды іншых краін».

Ідэя Алега Карцава з падводным паркам трымаецца не толькі на энтузіязме. Пасля таго, як кіраўнік Беларусі падпісаў «Праграму развіцця курортнай зоны Нарачанскага рэгіёна», дайверам выдзелілі пад стварэнне парку ў дадатак да возера 1,5 гектара зямлі на беразе пад будаўніцтва адпаведнай інфраструктуры — гатэлю, комплексу для навучання пачаткоўцаў. Апроч згаданага верталёта на дно возера Рудакова плануецца апусціць яшчэ каля сямі аб'ектаў. Што гэта будзе — пакуль не вядома, але размовы ходзяць нават пра затапленне танка Т–64Б. Што праўда, дайверы абяцаюць не толькі жалеззе тапіць, але і развесці ў возеры рыбу, вычысціць яго тэрыторыю ад смецця.

Аднак экалагі і навукоўцы захапленне Карцава не падзяляюць. Яны нават накіравалі адмысловы ліст міністру прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя і генеральнаму дырэктару Нацыянальнага парку «Нарачанскі», у якім выказалі свой пратэст з нагоды стварэння ў ахоўваемай зоне такога комплексу для дайвераў. «Возера Рудакова — гэта не толькі адзін з прыгажэйшых вадаёмаў Нарачанскага рэгіёна. Гэта яшчэ і надзвычай каштоўны ў экалагічным і навуковым дачыненні прыродны аб'ект», — гаворыць аўтары ліста.

Яны тлумачаць, чаму нельгаператвараць возера ў сметнік патэнцыйна небяспечных для экасістэмы возера прадметаў: «Рудакова — параўнальна невялікі непраточны вадаём. Корпус верталёта ўтрымлівае значную колькасць такіх металаў, як алюміній, цынк, медзь, свінец і інш. Непазбежны працэс карозіі корпуса прывядзе да ўзбагачэння вады таксічнымі злучэннямі, такімі, як солі алюмінія, цяжкіх металаў ды іншых. Гэтыя злучэнні аказваюць згубнае ўздзеянне на ўсе віды жывёл і раслінных арганізмаў ад бактэрый і водарасцяў да рыб. Такім чынам, затоплены корпус верталёта — гэта міна запаволенага дзеяння, ён уяўляе пагрозу для экасістэмы возера Рудакова».

Навукоўцы звяртаюць увагу, што ў 2008–2009 гадах у Беларускім дзяржаўным універсітэце ў рамках Дзяржаўнай навуковатэхнічнай праграмы «Экалагічная бяспека» былі выкананы адмысловыя даследаванні па распрацоўцы «Стратэгіі кіравання экасістэмай возера Рудакова». Але, калі прымалася рашэнне пра затапленне верталёта, ніхто не палічыў патрэбным пракансультавацца з навукоўцамі, у выніку было прынятае «абсалютна непісьменнае з экалагічнага пункта гледзішча рашэнне».

Пад гэтым лістом падпісаліся шэраг навукоўцаў з Белдзяржуніверсітэта, НАН Беларусі, а таксама дырэктар буйнейшага дайвінг-клуба «Марскі Пегас». Да слова, падпісанты ліста апелююць не толькі да экалагічнага фактару, але і да бяспекі людзей: «Затапленне верталёта на лёгка дасяжнай нырцамі глыбіні ў 10 метраў дае магчымасць і правакуе неарганізаваных дайвераў, без адмысловага абсталявання і страхоўкі з боку інструктара, пранікаць унутр верталёта, што ставрае вялікую небяспеку для іх жыцця».

«Мы з вялікім запалам падтрымліваем рашэнне аб стварэнні падводнага парку для дайвераў з мэтай развіцця турызму на Нарачаншчыне і гатовыя прыняць самы актыўны ўдзел у яго рэалізацыі. Але нельга, прыкрываючыся добрымі намерамі, ператвараць адно з унікальных азёраў нашай краіны ў сметнік. Быў бы гэта кар'ер, якіх у краіне шмат, або тэхнічны вадаём, як, напрыклад Лукомль, тады б добра. Але Рудакова — гэтае пакуль яшчэ жывое возера, і, не буду хаваць, адно з самых маіх улюблёных. У ім я перыядычна ныраю ўжо каля 30 гадоў, і мне ёсць з чым параўноўваць. Я бачыў, якім яно было і якім стала, якая празрыстасць вады ў ім была раней і якая зараз, як шмат рыбы вадзілася», — агучыў сваю пазіцыю на партале www.wildlife.by дырэктар дайвінг-клуба «Марскі Пегас» Андрэй Ліхачоў.

Паводле слоў Ліхачова, пасля правядзення незалежнай ацэнкі выявіліся факты ндобрасумленнай падрыхтоўкі аб'екта да затаплення, высветлілася, што фюзеляж верталёта знаходзіцца ў вельмі нездавальняючым стане, і загады Міністэрствы прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя не былі выкананы. Фатаграфіі і відэа, зробленыя яшчэ да моманту апускання, выразна сведчаць пра гэта. «Ідэя стварэння штучных рыфаў не новая, у яе ёсць як прыхільнікі, так і супернікі. Найперш яна патрабуе ўважлівага падыходу ў кожным канкрэтным выпадку. Што тапіць, дзе тапіць, навошта, што з гэтага атрымаецца і г. д. Не ўсё можна апускаць нават у моры і акіян. І ўжо зусім іншае — закрыты непраточны вадаём, куды «закінулі» тэхніку, якая адслужыла свой век. Хаця больш правільна было б затапіць адмысловыя канструкцыі з інертных да воднага асяроддзя і яго насельнікаў матэрыялаў», — лічыць Ліхачоў.

На форуме дайвінгу, падводнага палявання і фрыдайвінга www.divers.by (беларускі рэсурс) прэзідэнт Расійскага некамерцыйнага дабрачыннага фонду развіцця падводных экалагічных праграм «Штучныя рыфы» Сяргей Фядотаў выказаў меркаванне, што «стварэнне штучных рыфаў — шлях неадназначны».

«Праблемы са штучнымі рыфамі са смецця могуць узнікнуць не адразу. Амерыканскі пакрышкавы рыф быў прызнаны экалагічнай катастрофай праз 20 гадоў! Расійскія даследчыкі пакрышак толькі праз 5 гадоў убачылі, што ўсе іх старыя марскія жыхары падыхаюць, — даводзіць пра наступствы памылак Фядотаў. — Калі тапіць алюміній у моры, дык там хоць вада праточная, і труціцца будуць толькі рыбы і крабы, якія пастаянна «пасвяцца» на водарасцях і малюсках, прарослых на самалётах. З замкнёнымі вадаёмамі сітуацыя больш складаная. У азёрах самалёты не ўзлятаюць са дна падчас шторму, але карысна ведаць, што алюміній для тых, хто робіць штучныя рыфы не для эканомікі, а для экалогіі, — праклятыя матэрыял. А для тых, хто робіць іх дзеля грошай, — нармалёвы».

ЛІСТ У РЭДАКЦЫЮ

# ВЫСОКІЯ КАБІНЕТЫ

**Напрыканцы сакавіка група грамадзян мела намер патрапіць на прыём да кіраўніка Адміністрацыі прэзідэнта Уладзіміра Макея. Пра тое, што атрымалася з гэтай задумы, у рэдакцыю напісала Тамара Гулезава.**



Уладзімір Макей

«Мы ў чарговы раз атрымалі доказ, што Макей — самы недаступны чыноўнік краіны, — гаворыць у сваім лісце Тамара Гулезава, адна з прадстаўніц групы грамадзян, якія патрабуюць судовага перагляду крымінальных ды гаспадарчых спраў, заведзеных на іх саміх ці родных. — Начальнікам галоўнага ўпраўлення па рабоце са зваротамі грамадзян і юрыдычных асобаў кожнаму з нас была накіраваная адпіска з адмовай у асабістым прыёме па папярэднім запісе. Ніводны заяўнік з прысутных не быў запрошаны да высокага саноўніка».

Аднак візіцёры вырашылі пачакаць і паглядзець, хто ж патрапіць на прыём да Уладзіміра Макея. Да канца працоўнага дня ніхто быццам бы не з'явіўся. Пазней стала вядома, што ў той дзень на прыём да кіраўніка Адміністрацыі прэзідэнта змаглі патрапіць чатыры асобы, а правялі іх у будынак праз іншы пад'езд, таму Тамара Гулезава і яе «сябры па няшчасцю» не сутыкнуліся з гэтымі шчаслівчыкамі ва ўладных калідорах. «Мы даведаліся, што адзін з гэтых людзей прыйшоў у Адміністрацыю з такой праблемай: на танку каля Дома афіцэраў знікла таблічка з надпісам «За Радзіму, за Сталіна!». Прасіў Макея аднавіць гістарычную справядлівасць і вярнуць надпіс на месца. Гэтага чалавека прынялі па такой пустой справе, размаўлялі з ім паўгадзіны, а нам адмовіла ва аўдыенцыі!» — абураецца Тамара Гулезава.

«Некалькі гадоў мы ходзім па розных інстанцыях, патрабуем, каб нашы справы перагледзелі. Часам усё ж нехта дамагаецца свайго, і тады ці здымаюць абвінавачванні з незаконна асуджаных, ці знаходзяць насамрэч вінаватых у злачынстве. Генеральны пракурор хоць неяк нас прымае, хоць для выгляду, не выдзяляючы на гэта адмысловага часу. У Адміністрацыі прэзідэнта, як бачыце, нас ігнаруюць. Хаця апошні раз заяву на візіт да Макея падпісалі 67 чалавек, — расказвае жанчына пра метады працы чыноўнікаў. — Мы запісалі ў кнізе «Скаргаў і прапаноў» Адміністрацыі прэзідэнта свае прэтэнзіі. Аднак я моцна сумняваюся, што насамрэч будзе праведзеная нейкая праверка, і, як напісана ў дырэктыве кіраўніка Беларусі «Аб мерах па далейшай дэбюракратызацыі дзяржаўнага апарата», вінаватыя будуць прыцягнутыя да адказнасці «аж но да вызвалення ад займаемай пасады». Увогуле, у нас стан работы з грамадзянамі фармальна лічыцца адным з асноўных крытэраў ацэнкі дзейнасці дзяржаўных органаў, ёсць асаблівы статус калектыўных зваротаў, але колькі не кажы народу «халва», саладзей ад гэтага не становіцца».

З НАГОДЫ

# Барыс Кіт: Я ЗАЎЖДЫ НАЗЫВАЎ СЯБЕ БЕЛАРУСАМ

◂ Працяг. Пачатак У №13.

Генадзь КЕСНЕР

**6 красавіка споўнілася 100 гадоў самаму знакамітаму беларусу свету — выбітнаму навукоўцу і грамадскаму дзеячу Барысу Кіту. Пры канцы сакавіка ў Франкфурце-на-Майне (Германія), дзе сёння жыве чалавек-легенда, з юбілярам сустрэліся рэдактар навін парталу TUT.BY Кастусь Лашкевіч і карэспандэнт «Новага часу» Генадзь Кеснер. Гутарка з Барысам Кітом доўжылася амаль дзве гадзіны. Сёння вашай увазе — працяг гэтага інтэрв'ю.**



***— Барыс Уладзіміравіч, яшчэ за тымі, савецкімі часамі, ці адсочвалі Вы, што адбываецца ў Беларусі? Ці падтрымлівалі кантакты са сваякамі, якія засталіся тут?***

— Увесь час сачыў. Я ездзіў нават у Беларусь у 1990-х гадах. Тады яшчэ спадар Шушкевіч кіраваў — вось на фотаздымку ён сядзіць — ён прыязджаў да мяне. Мяне тады надзвычай добра прымалі ў Беларусі. Я яшчэ ездзіў тады ў Маладзечна, дзе сабраліся ўсе мае былыя вучні, мяне вельмі добра сустракалі. Я паехаў у Горадню, у Навагрудак, у Карэлічы — і паўсюль мяне цудоўна спаткалі (смяецца).

***— Тады было такое нацыянальнае адраджэнне, усё ўздымалася, праводзіліся рэформы. На Вашу думку, чаму ўсё гэта не атрымалася? Чаму ўсё так хутка згасла?***

— Таму што да ўлады прыйшлі іншыя людзі. А чаму так адбылося? Трэба спытацца ў цяперашніх вышэйшых уладаў: чаму вы так робіце? А яшчэ, я думаю, быў вось Савецкі Саюз, які называюць «імперыяй зла», дык яшчэ засталіся яго парэшткі. Гэта такая «адрыжка» ад мінулага…

***— Вы ўсё жыццё імкнуліся гуртаваць беларусаў, дзе б ні знаходзіліся. Да вайны на Бацькаўшчыне працавалі ў гімназіях, ядналі беларускае школьніцтва, а потым ужо ў ЗША фактычна пабудавалі супольства ў Саўт-Рыверы. Вы цікавіцеся гісторыяй, дык чаму, на Вашу думку, у беларусаў працэс нацыястварэння пайшоў не так імкліва, як у суседзяў — палякаў, літоўцаў, тых жа ўкраінцаў?***

— Беларусаў стагоддзямі таўклі і злева, і справа. І яны не змаглі супрацьстаяць. Проста псіхалогія такая стварылася ў беларусаў. Беларусы — іншы народ, асобны ад літоўцаў ды іншых, ён больш мяккі, чалавечны, а іншыя — больш энергічныя, бадзёрыя і агрэсіўныя. Напрыклад, параўнаць, як захоўваліся беларусы пры немцах, і як — літоўцы і астатнія. Беларусаў не можна абвінаваціць, што яны забівалі габрэяў. А ўсе іншыя народы рабілі гэта ці дапамагалі тое рабіць. Салжаніцын напісаў дзве кнігі, дзе ёсць усё, нават рапарты галоўнага нямецкага камандавання ў Беларусі, якое піша ў Берлін: што з гэтымі беларусамі? Яны нам не дапамагаюць. Пытаемся, чаму вы не забіваеце габрэяў? Вось гэта трэба адзначыць як вельмі добрую і вялікую якасць беларусаў, што іх не можна абвінаваціць у бесчалавечнасці. Таму я ганаруся, што я — беларус, што мы ніколі не былі забойцамі.

***— Барыс Уладзіміравіч, Вы з'ехалі ў эміграцыю, калі наступалі «саветы», а ці застаўся хто-небудзь з Вашых сваякоў у СССР?***

— Засталася ўся мая сям'я — можа, чалавек сто. Але я не мог з імі падтрымліваць ніякай сувязі, бо працаваў у Амерыцы ў сакрэтнай службе і меў самую высокую даверанасць у Злучаных Штатах, таксама, як і фон Браўн. І, каб не выклікаць падазронасці, я не падтрымліваў сувязяў. Толькі ўскосна. Кантакты падтрымлівала мая жонка і ўсё мне расказвала.

***— Калі ў СССР пачалася перабудова, калі павеяў «свежы вецер» і пачалося абвяшчэнне незалежнасці розных краін. Як Вы даведаліся, што Беларусь стала незалежнай, абвясціла свой суверэнітэт? Як гэта ўспрынялі?***

— Было вядома, што Ельцын, Шушкевіч і Краўчук паехалі ў Белавежскую пушчу, добра выпілі і зрабілі добрую справу. І тады мы даведаліся, што Беларусь зрабілася незалежнай. Шушкевіч прыязджаў сюды, я яго вельмі добра прымаў і сказаў яму: Вы — вялікі беларускі чалавек, таму што ўпершыню ў гісторыі зрабілі беларусаў незалежнымі.

Што тычыцца мяне асабіста, то я страшэнна быў рады, я пісаў ва ўсіх кнігах, што для нас усіх прыйшоў найвялікшы час. Я вельмі-вельмі быў задаволены, і ўспрыняў усё з самымі лепшымі пачуццямі. З вялікай радасцю! (смяецца).

***— Тут быў Васіль Быкаў, з якім Вы сябравалі, ён пісаў шмат успамінаў пра Вас. Ён вельмі песімістычна глядзеў на будучыню Беларусі. А як Вам бачыцца перспектыва Беларусі? Застанецца Беларусь незалежнай, выжыве беларускі народ?***

— Я думаю, што выжыве. Ужо не тыя часы, што калісьці былі, і вось гэтая моладзь, хаця б яе частка, якая ўзгадавалася, яна стала элітай, і яна не дапусціць, каб Беларусь згінула. Вы гэтага не дапусціце! (смяецца).

***— А якое ў Вас асабіста засталося ўражанне ад Васіля Уладзіміравіча Быкава, ад таго часу, які Вы правялі з ім, ад гутарак?***

— Ён не толькі пісьменнік, але і прарок Беларусі. Ён быў маім найвялікшым беларускім сябрам, ён ведаў усё. Я яго з пачатку асабіста не ведаў. І раптам мне дасылае кнігу — чужы чалавек! — «У тумане». І піша: «Найпершаму беларусу ў свеце» (смяецца). Ён мне страшэнна многа дапамог, на Беларусі таксама, бо мяне тады яшчэ ў Беларусі не ведалі так добра. А тут сам Быкаў кажа пра мяне: гэта самы першы беларус на свеце!

Цэлы год мы спатыкаліся з Васілём кожны дзень. Мы разам ездзілі па ўсёй Германіі, я яму, майму вялікаму сябру, даў тут усе магчымасці. Ён пісаў пра мяне аповеды, і гэта быў самы найцікавейшы год у маім жыцці. Мы з ім нават у Францыю, у Парыж з'ездзілі. Я спрабаваў яму дапамагчы ўсім, чым толькі мог. Мы спатыкаліся вось тут, у гэтай кватэрцы, у аповедах пра гэта ўсё сказана.

***— Пра галоўныя дасягненні Вы ўжо сказалі. А ці ёсць нешта такое, што не атрымалася, але што Вы б вельмі хацелі зрабіць?***

— Асаблівых няўдач не было. Я быў здольным вучнем, я граў на скрыпцы, быў мастаком, але пазней усё прапала, бо трэба было рабіць нешта канкрэтнае. І вельмі добра, таму што я пайшоў у гімназію, скончыў матэматыку, і матэматыка мяне выцягнула. А каб я заняўся гісторыяй, то мыў бы посуд у рэстаранах Нью-Йорка замест таго, каб працаваць на Месяцавым праекце. Гісторыя таксама цікавая рэч, так што выбачайце, але тады былі патрэбны канкрэтныя навукі, не гуманітарныя, а дакладныя. На гэтым я і «выехаў».

Але я страшэнна люблю гісторыю, увесь час кажу пра гэта. У Навагрудскай гімназіі я быў лепшым вучнем па гісторыі. Прыходзіць настаўнік, пытаецца ўсіх-усіх, ніхто не ведае. А цяпер запытаемся спадара Кіта (смяецца). Бо спадар Кіт заўжды адкажа…

Я распавяду, як я запісваўся ў Віленскі універсітэт. Я прыйшоў і хацеў запісацца на гісторыю. А каля акенца, дзе ішоў запіс на гісторыю, стаіць сто чалавек! А направа, каля матэматычнага акенца, стаіць пяць чалавек. Думаю, а хто яго ведае, можа мяне тут і не прымуць, пайшоў запісацца туды і зрабіўся матэматыкам (усміхаецца).

***— Барыс Уладзіміравіч, Вы сядзелі і за палякамі, і за нацыстамі. Была небяспека, што Вас расстраляюць…***

— Трыццаць дзён, кожны дзень, я чакаў расстрэлу. Кожны дзень нагоняць трыццаць чалавек і ноччу расстраляюць дваццаць пяць. А мяне яшчэ пакідаюць. Я трыццаць разоў паміраў. Пазней мяне перавялі з Глыбокага ў Вілейку, у галоўную гестапаўскую турму. Кожны раз высвятлялі, што за чалавек, трэба яго ўжо расстраляць ці не. Самае галоўнае абвінавачанне было — сувязь з партызанамі, тады ўсе такія абвінавачанні былі.

А ў Вілейцы быў такі нямецкі гебітс-камісар. Усе нямецкія камісары мелі беларускіх дарадчыкаў, бо яны нічога не разумелі, што да Беларусі. І якраз у гэтага гебітс-камісара Шмідта быў дарадчыкам Кастусь Касяк — мой вучань. Як ён даведаўся, што мяне прывезлі ў ланцугах, ён грукаўся да ўсіх уладаў і ўрэшце дабіўся майго вызвалення.

Гэтыя трыццаць дзён былі самыя страшныя ў маім жыцці. Нас загналі ў Глыбокім у нейкі падвал — нават не ў турму, — там была маленькая печачка, якая ўвесь час курэла і выядала вочы. Вошы поўзалі цэлымі струменямі! Мне ўспамінаюцца некаторыя людзі. Напрыклад, адзін настаўнік, якога пасадзілі за сувязь з партызанамі. Я з ім вельмі пасябраваў. Адным разам ён мне кажа: слухайце, спадар Кіт, я адчуваю, што мяне сёння ноччу расстраляюць. А ў яго былі такія прыгожыя бліскучыя галянішчы — боты. Кажа: «Я вам падару боты». Я адказваю: «Што вы?! Хто вас расстраляе? Я ніколі не пайду на тое, каб узяць у вас боты». А ноччу яго ўзялі і расстралялі. Потым бачу — цэлы воз вопраткі, а наверсе яго боты — парэзаныя, ён іх парэзаў, каб немцам не дасталіся… Страшэнна было, дрэнна… Мучылі нашых бедных людзей, немцы страшэнна баяліся партызанаў, таму і забівалі нашмат больш нявінных людзей, чым вінаватых.

Яшчэ адзін чалавек сядзеў са мной, якога потым расстралялі. Ён распавёў: прыйшлі партызаны, зіма, а ён жыў каля чыгуначнай калейкі. Партызаны не ўсе былі цудоўныя. Многія мелі прошласць нецікавую. Бо Калінін ездзіў і вызваляў турэмшчыкаў. Маўляў, калі пойдзеце ў партызаны, вызвалім вас з турмы. Вось такі быў тып людзей. Яны хамілі, рабілі горшае. Дык гэтыя людзі падклалі бомбу пад рэйкі. А зіма, снег, і сляды акурат прывялі да хаты гэтага чалавека, нямецкі патруль прыляцеў і па слядах адразу яго арыштаваў. І расстралялі гэтага чалавека. Вось што мы перажылі…

***— Барыс Уладзіміравіч, у Навагрудку два гады таму быў заснаваны ваш музей. Для Беларусі гэта выключная з'ява, калі адчыняюць музей пры жыцці чалавека. Як вы ўспрынялі гэты факт?***

— З вялікім задавальненнем (смяецца). Я баюся, каб яго толькі не зачынілі. Дасць Бог, не зачыняць. Музей — гэта гісторыя народа, гэта ёсць найлепшая школа, дзе вучацца гісторыі. Музей — гэта каштоўнасць народа, і я хацеў бы, каб гэтая каштоўнасць засталася. Я ўжо паміраю, мне ўжо мала засталося, але я цешуся, што ўсё, што ў музеі ёсць, застанецца беларускаму народу.

Заканчэнне будзе

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ



## 21 КРАСАВІКА, СЕРАДА

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10** Зона Х.
**07.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** Сфера інтэрасаў.
**09.05** Дэтэктыў «Апостал» (Расія).
**10.05** Серыял «Агні вялікага горада».
**10.50** Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
**11.40** Відэафільм АТН «Петрыкаўская адысея» цыклу «Зямля беларуская».
**12.10** Дэтэктыўная меладрама «Сіняя барада» (Украіна).
**14.05** Дак. фільм «Беларускае кіно: асацыяцыі Алега Сільвановіча» (БТ).
**14.30** Хранікальна-дакументальны цыкл «Нябачны фронт» (Беларусь).
**15.15, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.25** Альманах вандраванняў.
**15.50** Дэтэктыўны серыял «Сяброўка адмысловага прызначэння» (Расія). 1-я серыя.
**16.50** Серыял «Агні вялікага горада».
**17.50** Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
**18.50, 00.00** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.25** «Спортлато 5 з 36». Забаўляльнае шоў.
**19.30** «КЕНО».
**19.35** Відэафільм АТН «Я буду гаварыць».
**19.50** Дэтэктыў «Апостал» (Расія).
**21.00** Панарама.
**21.35** Футбол. Лігі чэмпіёнаў УЕФА. Паўфінал. Баварыя - Ліён. Прамая трансляцыя.
**00.05** Дзень спорту.

**06.00, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**10.00** «Крэм». Шматсерыйны фільм.
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Дэтэктывы».
**11.50** «Ералаш».
**12.00** «Малахаў +».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.40** «Модны прысуд».
**14.45** «Кантрольны закуп».
**15.15** «Віёла Тараканава. У свеце злачыннага запалу». Шматсерыйны фільм. Заключная серыя.
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** Прэм'ера. «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**17.05** «Хай кажуць».
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** Камедыйны серыял «Мая выдатная няня». Пасля вяселля, 2008 год.
**19.00** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Прэм'ера. «Цыганкі». Шматсер. фільм.
**22.15** «Крэм». Шматсерыйны фільм.
**23.10** Нашы навіны.
**23.25** Навіны спорту.
**23.30** «Дакументальны дэтэктыў».
**00.05** «Жанатыя... з дзецьмі». Шматсерыйны фільм.
**00.50** Нашы навіны.
**01.05** Навіны спорту.

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Салдаты. Дзембель непазбежны!» Серыял.
**09.30** «Аўтапанарама».
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.40** «Анёл-захавальнік». Тэленавэла.
**11.30** «Далёкія сваякі».
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Мачаха». Серыял.
**13.50** «Дэтэктыўныя гісторыі».
**14.40** «Свая каманда». Моладзевы серыял.
**15.35** «Водбліскі». Серыял.
**16.50** «Новыя падарожжы дылетанта».
**17.20** «Мінщчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Мачаха». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** Прэм'ера! «Салдаты. Дзембель непазбежны!» Серыял.
**21.30** Прэм'ера! «Водбліскі». Серыял.
**22.55** «Мінск і мінчане».
**23.25** «Рэпарцёрскія гісторыі».
**23.50** Фільм «Пузыр». ЗША, 2005г.

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**08.30** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**09.30** У гэты дзень.
**09.35** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**10.45** Дэтэктыўная камедыя «Людзі Шпака» (Расія).
**11.45** Рэпарцёр «Беларускай часіны».
**12.30** Спорт-кадр.
**13.00** Хакей. Чэмпіянат свету U-18. 1/4 фіналу.
**14.55** Мультфільм.
**15.10** Пазакласная гадзіна.
**15.25** Лабірынты: Бенедыкт Дыбоўскі.
**15.50** Медычныя таямніцы.
**16.20** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**17.25** Простыя практыкаванні з Ю.Афанасьевым (Расія).
**18.00** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**19.05** Дэтэктыўная камедыя «Людзі Шпака» (Расія).
**20.10** Беларуская часіна.
**21.15** Калыханка.
**21.35** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**22.10** Хакей. Чэмпіянат свету U-18. Паўфінал.

### РОССИЯ

**07.00** «Гарадок».
**08.00** «Гукавая дарожка «Маскоўскага камсамольца» у Лужніках».
**09.20** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне».
**10.10** «Кошт перамогі. Генерал Гарбатаў». Дакументальны фільм.
**11.00** Весткі.
**11.25** Тэлесерыял «Іван Грозны». Расія.
**13.05** «Гарадок.».
**13.20** «Кулагін і партнёры».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.25** «Два бакі адной Ганны». Тэлесерыял.
**15.15** Тэлесерыял «Я шпік».
**16.05** Прэм'ера. «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.15** «Кулагін і партнёры».
**17.50** Прэм'ера. «Карметіта. Цыганскі запал». Тэлесерыял. Расія, 2009 г.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.30** Прэм'ера. Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне». Расія, 2009 г.
**20.25** Тэлесерыял «Іван Грозны». Расія.
**22.20** Тэлесерыял «Дворык».
**22.55** Прэм'ера. «Два бакі адной Ганны». Тэлесерыял. Расія, 2009 г.
**23.50** Навіны - Беларусь.
**00.00** «Весткі+».
**00.20** Прэм'ера. «З герояў - у здраднікі. Власаўцы». Дакументальны фільм.

### НТВ

**08.35** «Следства вялі…».
**09.20** «Іх норавы».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Сярэдні клас».
**10.55** «Дачны адказ».
**11.55** Дэтэктыўны серыял «Шпікі».
**13.00** Сёння.
**13.30** Серыял «Таксістка».
**15.05** «Галоўная дарога».
**15.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.30** Дэтэктыўны серыял «Вісякі».
**18.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял «Кодэкс гонару».
**21.40** Дэтэктыўны серыял «Ментоўскія войны».
**23.25** Сёння.
**23.50** «Позняя гутарка».
**00.30** «Першая кроў».

### EUROSPORT

**09.30** Экстрэмальныя віды спорту. Free Ride Spirit. Вербье (Швейцарыя).
**10.00** Снукер. Чэмпіянат свету. Шэфілд (Вялікабрытанія). Дзень 4.
**12.00** Снукер. Чэмпіянат свету. Шэфілд (Вялікабрытанія). Дзень 5.
**15.00** Веласпорт. Велагонка Флэш Валонь.
**17.30** Снукер. Чэмпіянат свету. Шэфілд (Вялікабрытанія). Дзень 5.
**19.30** Футб ол. Еўрагалы. Навіны.
**19.40** Абранае па серадах.
**19.50** Конны спорт. Кубак свету. Канкур. Жэнева (Швейцарыя).
**20.50** Навіны коннага спорту.
**21.00** Гольф клуб. Навіны гольфа.
**21.05** Яхт клуб. Навіны ветразевага спорту.
**21.10** Абранае па серадах.
**21.15** Снукер. Чэмпіянат свету. Шэфілд (Вялікабрытанія). Дзень 5.
**00.00** «Алімпійскія гульні». Алімпійскі часопіс.
**00.30** Веласпорт. Велагонка Флэш Валонь.
**01.25** Веласпорт. «Планета Армстронг». Часопіс.
**01.30** Снукер. Чэмпіянат свету. Шэфілд (Вялікабрытанія). Дзень 5.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Ранча Піковая Сямёрка», серыял.
**17.40** «Каханне, здрада, жарсць», серыял.
**18.30** Аблічча таталітарызму: «Падзенне жалезнай заслоны», 2009 г., Германія: 1 серыя, «Салідарнасць Гэнрыкі».
**19.30** «Прыгоды Ціўкі», мультсерыял.
**19.40** На колах.
**20.05** Невядомая Беларусь: «Дарога да пекла. Атрута», дак. фільм, 2008 г., Беларусь: ч. 1.
**20.30** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**20.40** Беларусы ў Польшчы.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.20** Еўрапейскі Звяз без сакрэтаў: «Еўразвяз змагаецца з голадам».
**21.40** Рэпартэр.
**22.10** «Мужчынскі клопат», камедыя, ЗША.
**23.45** Аб'ектыў.

## 22 КРАСАВІКА, ЧАЦВЕР

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10** Зона Х.
**07.30, 08.40, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.45** Адмысловы рэпартаж АТН «12+1».
**09.05** Дэтэктыў «Апостал» (Расія).
**10.00** Меладраматычны серыял «Агні вялікага горада» (Расія).
**10.50** Камедыйная меладрама «Не нарадзіся прыгожай» (Расія).
**11.35** «OFF STAGE LIFE».
**12.10** Меладрама «Толькі вярніся».
**13.45** Дак. цыкл «Фартыфікацыя».
**14.30** Хранікальна-дакументальны цыкл «Гарачыя кропкі» (Беларусь).
**15.15, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.25** Уласнай персонай.
**15.55** Дэтэктыўны серыял «Сяброўка адмысловага прызначэння» (Расія).
**16.55** Меладраматычны серыял «Агні вялікага горада» (Расія).
**17.50** Камедыйная меладрама «Не нарадзіся прыгожай» (Расія).
**18.50, 00.05** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.25** «КЕНО».
**19.30** Сфера інтэрасаў.
**19.55** Дэтэктыў «Апостал» (Расія).
**21.00** Панарама.
**21.55** Актуальнае інтэрв'ю.
**22.10** Прэм'ера! Дакументальны цыкл «Вялікая вайна» (Расія - Украіна) Фільм «Барбароса».
**23.05** Вострасюжэтная ваенная драма «Застава Жыліна» (Расія).
**00.10** Дзень спорту.

**06.00, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**10.00** «Крэм». Шматсерыйны фільм.
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Дэтэктывы».
**11.50** «Ералаш».
**12.00** «Малахаў +».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.40** «Модны прысуд».
**14.45** «Кантрольны закуп».
**15.15** Тэорыя неверагоднасці.
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** Прэм'ера. «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**17.05** «Хай кажуць».
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** Камедыйны серыял «Мая выдатная няня». Пасля вяселля, 2008 год.
**19.00** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Прэм'ера. «Цыганкі». Шматсер. фільм.
**22.15** «Крэм». Шматсерыйны фільм. Заключная серыя.
**23.10** Нашы навіны.
**23.25** Навіны спорту.
**23.30** АНТ прадстаўляе: «Выбар +».
**00.00** «Жанатыя... з дзецьмі». Шматсерыйны фільм.
**00.45** Нашы навіны.
**01.00** Навіны спорту.

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Мінщчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Салдаты. Дзембель непазбежны!» Серыял.
**09.30** «Я-вандроўца».
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.40** «Анёл-захавальнік». Тэленавэла.
**11.30** «Далёкія сваякі».
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Мачаха». Серыял.
**13.50** «Фантастычныя гісторыі».
**14.40** «Свая каманда». Моладзевы серыял.
**15.40** «Водблікі». Серыял.
**16.50** «Добры дзень, доктар!».
**17.20** «Мінщчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Мачаха». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** Прэм'ера! «Салдаты. Дзембель непазбежны!» Серыял.
**21.30** Прэм'ера! «Водблікі». Серыял.
**22.55** «Асабістыя інтэрас».
**23.25** «Аўтапанарама».
**23.45** Фільм «Паглядзі на мяне». Францыя-Італія, 2004 г.

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**08.30** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**09.35** У гэты дзень.
**09.40** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**10.45** Дэтэктыўная камедыя «Людзі Шпака» (Расія).
**11.50** Экспедыцыя.
**12.15** Бітва экстрасэнсаў.
**13.20** Хакей. Чэмпіянат свету U-18. Паўфінал.
**15.20** Пазакласная гадзіна.
**15.35** Жывы гук.
**16.15** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**17.20** Простыя практыкаванні з Ю.Афанасьевым (Расія).
**17.55** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**18.55** Хакей. Турнір чатырох. Беларусь-Славакія. Прамая трансляцыя.
**21.20** Калыханка.
**21.40** Пасоўванне+.
**22.00** Футбол. Ліга Еўропы. Паўфінал. Атлетыка-Ліверпуль. Прамая трансляцыя.
**00.00** Час футболу.
**00.30** Футбол. Ліга Еўропы. Паўфінал. Гамбург-Фулхем.

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.20** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне». Расія, 2009 г.
**10.10** «Хто заплаціў Леніну? Таямніца стагоддзя». Дакументальны фільм.
**11.00** Весткі.
**11.25** Тэлесерыял «Іван Грозны». Расія.
**13.05** «Гарадок.»
**13.20** «Кулагін і партнёры».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.25** Прэм'ера. «Два бакі адной Ганны». Тэлесерыял. Расія, 2009 г.
**15.15** Тэлесерыял «Я шпік».
**16.05** Прэм'ера. «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.15** «Кулагін і партнёры».
**17.50** Прэм'ера. «Карметіта. Цыганскі запал». Тэлесерыял. Расія, 2009 г.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.30** Прэм'ера. Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне». Расія, 2009 г.
**20.25** Тэлесерыял «Іван Грозны». Расія.
**22.20** Тэлесерыял «Дворык.
**22.55** Прэм'ера. «Два бакі адной Ганны». Тэлесерыял. Расія, 2009 г.
**23.50** Навіны - Беларусь.
**00.00** «Весткі+».
**00.20** Прэм'ера. «Вызваліцелі». «Артылерысты». Дакументальны фільм.

### НТВ

**07.00** Сёння.
**07.05** Інфармацыйны канал «Сёння раніцай».
**08.25** Праект «У пошуках Францы».
**09.15** «Жаночы погляд».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Сярэдні клас».
**10.55** «Вочная стаўка».
**11.40** «Прафесія-рэпарцёр».
**12.05** Дэтэктыўны серыял «Шпікі».
**13.00** Сёння.
**13.30** Серыял «Таксістка».
**15.05** «Прафесія-рэпарцёр».
**15.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.30** Дэтэктыўны серыял «Вісякі».
**18.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.30** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял «Кодэкс гонару».
**21.35** Дэтэктыўны серыял «Ментоўскія войны».
**23.25** Сёння.
**23.50** «Алтар Перамогі».
**00.35** «Асабліва небяспечны!».

### EUROSPORT

**09.30** Аўтаспорт. Сусветная серыя Рэно. Альканьіс (Іспанія). Агляд.
**10.00** Футбол. Клуб чэмпіёнаў. Часопіс.
**10.30** Снукер. Чэмпіянат свету. Шэфілд (Вялікабрытанія). Дзень 5.
**12.00** Веласпорт. Велагонка Флэш Валонь. Бельгія.
**13.25** Веласпорт. «Планета Армстронг». Часопіс.
**13.30** Снукер. Чэмпіянат свету. Шэфілд (Вялікабрытанія). Дзень 5.
**16.00** Снукер. Чэмпіянат свету. Шэфілд (Вялікабрытанія). Дзень 6.
**19.00** Самыя моцныя людзі планеты. Ліга чэмпіёнаў. Украіна.
**20.00** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**20.10** Снукер. Чэмпіянат свету. Шэфілд (Вялікабрытанія). Дзень 5.
**21.00** Снукер. Чэмпіянат свету. Шэфілд (Вялікабрытанія). Дзень 6.
**00.00** Пра рэстлінг. Vintage Collection. ЗША.
**01.00** Пра рэстлінг. Агляд WWE (World Wrestling Entertainment).
**01.30** Снукер. Чэмпіянат свету. Шэфілд (Вялікабрытанія). Дзень 6.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Ранча Піковая Сямёрка», серыял.
**17.35** «Год каметы», прыгодніцкая камедыя, 1992 г., ЗША.
**19.05** Асабісты капітал.
**19.25** «Прыгоды Ціўкі», мультсерыял.
**19.40** Праект «Будучыня».
**20.05** Невядомая Беларусь: «Напрамеяваныя хлуснёй», дак. фільм, 2007 г., Беларусь: ч. 2.
**20.40** Рэмарка (культурніцкая праграма).
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.20** Форум (ток-шоу): «Чарнобыль у нашых сэрцах».
**22.05** «Загадкі Мэрдака», дэтэктыўны серыял.
**22.50** Рэпартэр.
**23.20** Аб'ектыў.

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ



## 25 КРАСАВІКА, НЯДЗЕЛЯ

**[Першы канал]**

**07.40** Анімацыйны дэтэктыў «Праўдзівая гісторыя Чырвонай Шапкі» (ЗША).
**09.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**09.05** «Арсенал».
**09.35** «Зброя». Цыкл дакументальных фільмаў (Беларусь).
**09.50** Альманах вандраванняў.
**10.15** Культурныя людзі.
**10.50** У свеце матораў.
**11.25** Nota Bene.
**12.10** Кінааповесць «А зоры тут ціхія…» (СССР). 2-я серыя.
**13.55** Дакументальны цыкл «Вялікая вайна» (Расія - Украіна). Фільм «Блакада Ленінграда».
**15.10** Навіны рэгіёна.
**15.30** Відэафільм АТН «Беларускі біятлон. Папраўка на вецер».
**15.55** «У чаканні Мундыяля». Дзённік чэмпіянату свету па футболе-2010.
**16.20** «Футбол. Ліга чэмпіёнаў». Відэачасопіс.
**16.55** Дакументальна-біяграфічны цыкл «Зорнае жыццё» (Украіна).
**18.00** Суперлато.
**19.15** Дакументальна-біяграфічны цыкл «Мая праўда» (Украіна).
**20.30** «Спортлато 5 з 36». Забаўляльнае шоў.
**20.50** «КЕНО».
**21.00** «У цэнтры ўвагі».
**22.10** Дакументальны цыкл «Вялікая вайна» (Расія - Украіна). Фільм «Сталінград».
**23.05** Ваенная драма «Разжалаваны» (Расія).

**[ОНТ]**

**07.00** АНТ прадстаўляе: «Нядзельная раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Нядзельная пропаведзь.
**09.20** Камедыйны серыял «Хто ў хаце гаспадар?» (Расія), 2005 год.
**09.55** «Шалапутныя нататкі».
**10.15** Пакуль усе дома.
**11.10** «Шчасце ёсць!».
**12.00** АНТ прадстаўляе: «Ранішняя пошта».
**12.35** «Фазэнда».
**13.15** «Разумніцы і разумнікі».
**14.00** «Песні Перамогі».
**14.30** Тэорыя неверагоднасці.
**15.05** Прэм'ера. Севастопальскія аповяды.
**16.00** Нашы навіны.
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** «Клуб Вясёлых і Знаходлівых». Вышэйшая ліга.
**18.55** Прэм'ера АНТ: «Давай ажэнімся!».
**20.00** Контуры.
**21.05** АНТ прадстаўляе: «Міс Беларусь - 2010».
**23.05** «Вялікая розніца».
**00.05** «Паўднёвае Бутава».

**[СТВ]**

**07.05** «Афрамасквіч». Камедыйны серыял.
**07.30** «24 гадзіны».
**07.40** «Я-вандроўца».
**08.00** Фільм «Хлопчык у дзяўчынцы». Канада-Вялікабрытанія, 2006 г.
**09.30** «Аўтапанарама».
**10.00** «Відавочнік прадстаўляе: самае смешнае».
**10.30** «24 гадзіны».
**10.40** «Вялікі сняданак».
**11.15** «Салдаты. Залатыя серыі».
**13.00** «Добры дзень, доктар!».
**13.30** «24 гадзіны».
**13.50** Фільм «Семнаццаць імгненняў вясны». СССР, 1973 г. 7-я, 8-я серыі.
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Рэпарцёрскія гісторыі».
**17.20** Канцэрт М.Задорнава.
**19.00** «Аўтапанарама».
**19.30** «Тыдзень». Інфармацыйна-аналітычная праграма.
**20.40** Фільм «Доказ». ЗША, 2004 г.
**22.30** «24 гадзіны».
**22.55** «Прафесійны бокс».
**23.50** Фільм «Усе сціюардэсы трапляюць на нябёсы». Іспанія-Аргенціна, 2002 г.
**01.20** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

**[ЛАД]**

**07.15** Дабравест.
**07.45** Мір вашай хаце.
**07.55** Кулінарная праграма «Смачна з Барысам Бурдой».
**08.20** Кінааповесць «Мы смерці глядзелі ў твар» (СССР).
**09.45** Школа рамонту.
**10.50** Медычныя таямніцы.
**11.40** Кінаспробы.
**12.00** Бухта капітанаў.
**12.40** «Правы чалавека».
**12.55** Хакей. Турнір чатырох. Германія-Славакія. Прамая трансляцыя.
**15.15** Гаспадар.
**15.45** Пасоўванне+.
**16.00** Дакументальны цыкл «Неверагодныя гісторыі кахання» (Украіна).
**16.55** Хакей. Турнір чатырох. Беларусь-Швейцарыя. Прамая трансляцыя.
**19.20** Нашы тэсты.
**19.55** Экспедыцыя.
**20.30** Тэлебарометр.
**20.50** Смешная часіна.
**21.30** Рамантычная камедыя «Алекс і Эма» (ЗША).



**23.25** Свая музыка. Працяг.
**23.55** Пасоўванне+.
**23.25** Свая музыка. Працяг.
**23.55** Пасоўванне+.

**[РОССИЯ]**

**07.00** «Здабытак рэспублікі».
**07.30** Фільм «Чырвоны лотас». Расія, 2009 г.
**09.10** Фільм «Каханне на сене». Расія, 2010 г.
**11.00** Весткі.
**11.10** «Сам сабе рэжысёр».
**12.10** Фільм «Афёра Цэпліса».
**14.00** Весткі.
**14.10** «Смехапанарама Яўгенія Петрасяна».
**14.50** Прэм'ера. «Расія супраць Гітлера». Белград. Дакументальны фільм.
**15.20** Фільм «Жаўрук».
**17.20** Прэм'ера. «Аншлаг і Кампанія».
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі тыдня.
**20.05** «Сумленны дэтэктыў».
**20.45** Прэм'ера. «Танцы з Зоркамі». Сезон - 2010.
**23.45** Навіны - Беларусь.
**23.55** «Адмысловы карэспандэнт».

**[НТВ]**

**07.40** Мультфільм.
**08.00** Сёння.
**08.20** «Дзікі свет».
**08.50** «Іх норавы».
**09.25** «Ямо дома!».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Выратавальнікі».
**10.50** «Асабліва небяспечны!».
**11.25** «Першая кроў».
**11.55** «Дачны адказ».
**13.00** Сёння.
**13.20** Прэм'ера. Праект «У пошуках Францыі».
**14.15** Прыгодніцкая фантастыка «Таямніцы Бермутскага трохкутніка. Фільм -3».
**16.00** Сёння.
**16.25** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял «Адвакат».
**17.20** «І зноў добры дзень!».
**18.25** «Надзвычайнае здарэнне. Агляд за тыдзень».
**19.00** Сёння. Выніковая праграма.
**19.55** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**20.30** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял «Брудная праца».
**00.05** «Авіятары».
**00.35** «Футбольная ноч».

**[EUROSPORT]**

**09.30** Снукер. Чэмпіянат свету. Шэфілд (Вялікабрытанія). Дзень 8.
**11.00** Марафон. Лондан.
**14.00** Супербайк. Чэмпіянат свету.
**14.15** Суперспорт. Чэмпіянат свету. Асэн (Нідэрланды).
**15.00** Веласпорт. Велагонка Льеж-Бастон-Льеж. Бельгія.
**18.00** Снукер. Чэмпіянат свету. Шэфілд (Вялікабрытанія). Дзень 9.
**19.00** Спартовая гімнастыка. Чэмпіянат Еўропы. Мужчыны. Бірмінгем (Вялікабрытанія). Фінал.
**20.00** Супербайк. Чэмпіянат свету. Асэн (Нідэрланды). Заезд 1.
**20.30** Супербайк. Чэмпіянат свету. Асэн (Нідэрланды). Заезд 2.
**21.00** Мотаспартыўны часопіс.
**21.15** Снукер. Чэмпіянат свету. Шэфілд (Вялікабрытанія). Дзень 9.
**00.00** Бокс.
**01.00** Веласпорт. «Планета Армстронг». Часопіс.
**01.05** Футзала. Кубак УЕФА. Лісабон (Партугалія). Фінал.
**02.15** Мотаспартыўны часопіс.

**[БЕЛСАТ tv]**

**17.05** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**17.20** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**17.30** «Арол: крымінальная сага», серыял.
**18.30** «Белы ветразь над Прыпяццю», дак. фільм, 2009 г., Беларусь.
**19.30** «Прыгоды Ціўкі», мультсерыял.
**19.40** «Старадаўнія інструменты Беларусі», дак. фільм, 2007 г., Беларусь: ч. 2.
**20.00** Басанож па свеце.
**20.30** Акно ў Еўропу.
**21.00** Тыдзень у «Аб'ектыве».
**21.30** Фільматэка майстроў: «Нявеста пірата», драма, 1969 г., Францыя.
**23.00** Тыдзень у «Аб'ектыве».

---


# Шаноўныя чытачы!

**Газета «Новы час» працягвае падпіску. Падпісацца можна на перыяд ад 1 месяца да 1 года праз пошту або праз банк.**

## Падпіска на «Новы час» праз пошту

1. Выразаем купон.
2. На ПАШТОВЫМ ПЕРАВОДЗЕ пішам суму грашовага пераводу ў лічбах і прапісам.
3. У графе «Ад каго» пішам прозвішча, імя, імя па бацьку.
4. Ніжэй указваем адрас.
5. Ідзем на бліжэйшае паштовае аддзяленне і здзяйсняем паштовы перавод.
6. Ксеракопію плацёжнага дакумента, атрыманага вамі, з указаннем тэрміну падпіскі і адрасам дастаўкі накіроўваем у рэдакцыю.
7. Кошт падпіскі за адзін нумар — 500 рублёў (на адзін месяц — 2000 рублёў).

БЕЛПОЧТА ф. ПС 112

ЭЛЕКТРОННЫЙ ДЕНЕЖНЫЙ ПЕРЕВОД

№ ______ (вход, по карте отправки)

ВЫРУЧКА ☐ НАЛОЖЕННЫЙ ПЛАТЕЖ ☐

(сумма цифрами) (сумма прописью)

ПОЛУЧАТЕЛЬ___ Г-та «Новы час», р/с 3012211080010 фил. МГД ОАО «Белинвестбанк», код 153001764, УНН 190790926

КУДА 220004, г. Минск, ул. Коллекторная, 11
почтовый код, адрес получателя, телефон)

ОТПРАВИТЕЛЬ
почтовый код, адрес отправителя, телефон)

АДРЕС

Доставка ☐ уведомление ☐ простое ☐ заказное ☐ электронное

(назначение платежа)

(письменное сообщение)

Отметки отделения почтовой связи места приема:
(почтовый код, оттиск контрольно-переводной печати, кол. шт.)
№ перевода по ф. 5 ______________
Время приема _______ ч. _____ мин.
Подпись

## Падпіска на «Новы час» праз банк

1. Выразаем купон.
2. Пішам прозвішча, імя, імя па бацьку і адрас.
3. Указваем суму аплаты.
4. Ідзем у аддзяленне банка і здзяйсняем пералік грошай.
5. Ксеракопію плацёжнага дакумента, атрыманага вамі, з указаннем тэрміну падпіскі і адрасам дастаўкі накіроўваем у рэдакцыю.
6. Кошт падпіскі за адзін нумар — 500 рублёў (на адзін месяц — 2000 рублёў).

КВИТАНЦИЯ

ЧИУП «Час навінаў»
(получатель платежа)
МГД ОАО «Белинвестбанк» г. Минск
(наименование банка)
Счет получателя 3012211080010 Лицевой счет Код 764
УНП* 190790926
(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| | | | | |

Период подписки указывает абонент

Плательщик

Кассир Пеня ________ Всего ________

# Для тых, хто прымае рашэнні!

Новы час

www.novychas.org

ЦІКАВА

# ЯКІ СЦЭНАР ЧАКАЕ КЫРГЫЗСТАН

Алег НОВІКАЎ

**Замест таго, каб пасля рэвалюцыі бегчы з краіны, як гэта зрабіў Акаеў, Бакіеў нечакана аб'явіўся на поўдні Кыргызстана і ўпарта працягвае лічыць сябе адзіным легітымным кіргізскім кіраўніком. У сваю чаргу, новая ўлада баіцца ўжываць сілу ў мясцовасці, дзе Бакіеў карыстаецца значнай падтрымкай насельніцтва. Эксперты прагназуюць некалькі магчымых сцэнараў развіцця падзей у Кыргызстане.**






Нагадаем цяперашні расклад сілаў: сталіцу Бішкек і большую частку краіны кантралюе сфармаваны пасля рэвалюцыі кааліцыйны Часовы ўрад. Чальцы ўраду актыўна дзеляць міністэрскія партфелі і фліртуюць з Масквой, Астаной і Вашынгтонам, дамагаючыся афіцыйнага прызнання. Між тым, на поўдні, у вотчыне былога прэзідэнта Бакіева, нічога не змянілася, там па-ранейшаму прызнаюць уладу прэзідэнта. Бакіеў вядзе дзіўную, аднак актыўную гульню: то праводзіць курултаі ў сваю падтрымку і адмаўляецца аддаваць паўнамоцтвы, то заяўляе пра гатоўнасць сысці ў адстаўку, патрабуючы за гэта гарантыі бяспекі. Дык што ж будзе далей?

## Сцэнар першы

Бакіеў хутка складзе паўнамоцтвы і пакіне краіну. Нават калі б ён вельмі хацеў вярнуцца ў Бішкек, у яго няма для гэтага дастатковага рэсурсу падтрымкі ў сталічным рэгіёне. Яшчэ адзін фактар — пазіцыя Расіі. Як ні парадаксальна гучыць, рэвалюцыя была праведзена па замове Крамля. Маскву занепакоілі тэмпы нарастаючага сяброўства рэжыму Бакіева з Кітаем. Толькі за два гады праўлення Бакіева гандлёвы абарот паміж краінамі вырас у 12 разоў. А напачатку гэтага года адбыўся і ўвогуле гістарычны прарыў у кіргізска-кітайскіх адносінах. У студзені з візітам у Пекін прыбыў сын прэзідэнта Максім Бакіеў, які да апошніх падзей лічыўся ледзь не самым уплывовым чалавекам у асяроддзі свайго бацькі. Бакіеў-малодшы прапанаваў кітайскім партнёрам удзел у дабудаванні Камбарацінскай ГЭС–2, а таксама ў мадэрнізацыі вытворчасці крэмнію, які прымяняецца ў сонечнай энергетыкі. Кантракты на гэтыя праекты кіргізскае кіраўніцтва раней абяцала падпісаць з расійскімі бізнес-структурамі. Злучаныя Штаты, у сваю чаргу, яшчэ з часоў «рэвалюцыі цюльпанаў» дапамагаюць дэмакратам.

Уся цяперашняя дзейнасць Бакіева — спроба выйграць час. За гэты час можна паспрабаваць вывезці з краіны нажытыя капіталы (некаторыя аналітыкі ацэньваюць багацце клану прыкладна ў 300 мільёнаў долараў) і дапамагчы пакінуць краіну бліжэйшым родзічам і сябрам.

## Сцэнар другі

Бакіеў мае намер калі не паспрабаваць вярнуць уладу, то замацавацца на поўдні, чакаючы спрыяльных умоў для рэваншу. Сапраўды, галоўныя прычыны перавароту застаюцца. Гэта не вырашаныя сацыяльныя, эканамічныя і палітычныя праблемы. Аднак галоўная ягоная надзея — супярэчнасці ў лагеры пераможцаў. Перамога стала сюрпрызам нават для лідэраў апазіцыі, якія не маюць стратэгічнага плану развіцця краіны. Акрамя таго, да гэтага часу ў іх шэрагах не вызначаны лідэр, які змог бы трымаць пад кантролем сітуацыю ў краіне. Зараз Часовы ўрад складаецца з прадстаўнікоў шэрагу партый. Аднак у бліжэйшай перспектыве верагоднасць распаду такой кааліцыі вельмі вялікая. Узгадаем, чым закончыліся іншыя кааліцыі, сфарміраваныя падчас каляровых рэвалюцый, — Юшчанка і Цімашэнка, Саакашвілі, Жванія і Бурджанадзе і г. д. Бакіеву застаецца дачакацца часу распаду і падтрымаць адну з фракцый. Магчыма, гэта не гарантуе яму вяртанне ў крэсла прэзідэнта, аднак захоўвае ягоны статус уплывовай палітычнай фігуры. Па вялікаму рахунку, іншага выйсця ў яго няма.

Якія перспектывы чакаюць Бакіева, калі ён зараз усё кіне і падасца ў эмігранты? Гэта будзе аўтаматычна значыць адмову ад пасады дэмакратычна абранага прэзідэнта. Следствам стане хуткае прызнанне цяперашняй улады ў Бішкеку з боку іншых дзяржаў у якасці адзінай легітымнай. І першае, што зробяць сябры Часовага ўраду, — пададуць на Бакіева ў міжнародны вышук за арганізаваныя ім расстрэлы мірных грамадзян.

## Сцэнар трэці

Бакіеў, які спрабаваў гуляць на супрацьстаянні Расіі і ЗША, не карыстаецца стопрацэнтнай падтрымкай ні ў першым ні ў другім лагеры. Акрамя таго, і Вашынгтон і Масква хацелі б перш за ўсё бачыць блізкі да Афганістана Кыргызстан стабільнай зонай. У той жа час Кыргызстан у вачах усіх сатрапаў Сярэдняй Азіі ператварыўся ў нейкі жупел, падобны да таго, якім была якабінская Францыя для еўрапейскіх арыстакратаў. Навіны з Кыргызстана, калі меркаваць па каментарах на казахскіх форумах, выклікалі мноства надзей на палітычныя змены ў краіне. Тое ж самае і ва Узбекістане, дзе афіцыйныя СМІ дасюль нічога не кажуць пра пераварот у Бішкеку. Гавораць, што пад уплывам падзей у Кыргызстане таджыкскі прэзідэнт Рахмонаў перагледзеў кадравую палітыку — адмовіўся прызначаць на ўплывовыя адміністратыўныя пасады сваіх дзяцей і родных. Назарбаеву і Карымаву патрэбна стабільнасць у Кыргызстане. ЗША, Расія, краіны Сярэдняй Азіі могуць прапанаваць Бакіеву нейкія гарантыі бяспекі, каб толькі ён паконччыў з фрондай. У выпадку адмовы з ім можа адбыцца што заўгодна.

## Сцэнар чацвёрты

Бакіеў карыстаецца падтрымкай на поўдні і можа паспрабаваць гуляць на гістарычнай канкурэнцыі кланаў поўдня і поўначы. Ён ужо выступіў з ідэяй перанесці сталіцу ў Ош. Такі варыянт найменш рэальны — без знешняй падтрымкі моцнага геапалітычнага акцёра дабіцца стварэння ў Сярэдняй Азіі мясцовага Прыднястроўя амаль немагчыма. Ніхто, акрамя, магчыма, радыкальных ісламістаў, не зацікаўлены ў дэстабілізацыі. Аднак тут усё залежыць не ад замежнікаў, а ад сяброў Часовага ўраду, якім трэба ўзгадніць баланс інтарэсаў паміж рознымі кланавымі і рэгіянальнымі групамі. Першапачатковай мэтай дадзеных дамоў будзе, вядома ж, недапушчэнне дамінавання якой-небудзь з гэтых груп. Калі тое не атрымаецца, у Бакіева ёсць шанец стаць рэгіянальным лідэрам.

## Сцэнар пяты

Пакуль Бакіеў і Атунбаева змагаюцца за ўладу, бясспрэчным фактам застаецца беднасць насельніцтва Кыргызстана, якая і спраўакавала паўстанне. Нездарма Таласкі рэгіён, які апынуўся ў авангардзе паўстання, паводле дадзеных Нацыянальнага статыстычнага камітэта Кыргызстана, уваходзіць у тройку рэгіёнаў з самым высокім узроўнем беднасці. Ёсць вялікая верагоднасць таго, што шматлікія абяцанні новых улад так і застануцца абяцаннямі. Следствам можа стаць перафармаванне кіргізскай палітычнай сцэны, з'яўленне новай сілы. Такую ролю можа адыграць армія, якая пакуль займала нейтральную пазіцыю.

## ЯНЫ ПРА НАС: ЗАМЕЖНАЯ ПРЭСА ПРА БЕЛАРУСЬ

Старая «спрэчка славян паміж сабой» мае цалкам ясныя вытокі: расійскія сыравінныя карпарацыі зацікаўлены ў падвышэнні рэнтабельнасці паставак на Беларусь. Адначасова Расія таксама жадае набыць мясцовыя прадпрыемствы. 2010 год, відавочна, застанецца канфліктным у адносінах РФ, Беларусі і Украіны. Расія і Беларусь у адналькава тупіковым становішчы. Крызіс пазбавіў перспектыў іх ранейшы эканамічны курс. Абедзве краіны арыентуюцца на знешні гандаль, толькі для сыравіннай Расіі на першым месцы — рынак на Захадзе, а для Беларусі — на Усходзе.

**«Рабкор» (Расія)**

Рашэнне па амерыканскай авіябазе ў Кіргізіі — сімвалічнае, яно дэманструе агульнае стаўленне да Расіі, якое склалася на сусветнай арэне. Кіргізія — далёка не адзіны прыклад. 2 красавіка з Венесуэлы ў Беларусь адправіўся першы танкер з нафтай — ён праплыве праз палову зямнога шара, каб даставіць праз адэскі порт чорнае золата для Бацькі-Лукашэнкі, і ўсё гэта пры тым, што Мінск быццам бы дагэтуль будуе Саюзную дзяржаву з Расіяй — адным з галоўных экспарцёраў нафты. Добра б яшчэ, калі б Бацька здрадзіў Маскве з якой-небудзь Саудаўскай Аравіяй, а не з Венесуэлай. Гэта прыкладна тое, калі жонка здраджвае з лепшым сябрам, — удар удвая мацнейшы.

**Slon.ru (Расія)**

Не сакрэт, што афіцыйныя СМІ працуюць у Беларусі пад наглядам уладаў. Даходзіць да смешнага, калі сінхронна ў розных газетах з'яўляюцца практычна аднолькавыя матэрыялы на актуальныя тэмы з выразнай устаноўкай і акрэсленай пазіцыяй ідэалагічнай вертыкалі. У гэтым сэнсе дзяржаўныя СМІ ў інтэрнэце не моцна адрозніваюцца ад сваіх афлайнавых клонаў. Менавіта гэта стала чыннікам, з-за якога інтэрнэт-СМІ з альтэрнатыўнай пазіцыяй значна больш папулярныя за прадукты беларускай прапаганды. Аднак у апошні час каліcьці вольныя беларускія інтэрнэт-пляцоўкі ўсё часцей вымушаны адаптавацца пад усталяваныя ўрадам рамкі.

**«Electroname» (Украіна)**

У апошнія гады склалася ненармальная сітуацыя, калі, спасылаючыся на праект адзінай Саюзнай дзяржавы, дамова пра стварэнне якой была падпісаная больш за 10 гадоў таму, Беларусь патрабуе ад Расіі эканамічных ільготаў. Пры гэтым у падрабязнасці, перш за ўсё у сітуацыю вакол праекту Канстытуцыйнага акту, намагаюцца не ўдавацца. Усе дыскусіі адносна часу прыняцця гэтага ключавога дакумента ўвесь час пераносяцца на будучыню. Наспела неабходнасць ліквідаваць падобную калізію, што павінна змяніць характар абмеркавання пытання пра будучае супрацоўніцтва абедзвюх краін. Відавочна, гаворку варта весці пра развіццё стратэгічнага супрацоўніцтва Расіі і Беларусі. Гэта супрацоўніцтва сапраўды з кожным годам атрымлівае пэўнае напаўненне і адпавядае інтарэсам абедзвюх дзяржаў. У гэтай сувязі адмова ад утапічнай мэты, якой з'яўляецца стварэнне незразумелай па форме адзінай дзяржавы, і прывязденне супрацоўніцтва ў рамкі, прынятыя ў свеце, унясе ў адносіны больш выразнасці, ліквідуе палітычныя спекуляцыі і дазволіць развіваць раўнапраўнае супрацоўніцтва, за што ўвесь час і выступае беларускі прэзідэнт.

**«Независимая газета» (Расія)**

## МІЖНАРОДНЫЯ НАВІНЫ

### СЛАВАКІЯ. ВЫКЛАДЧЫКІ ВНУ НЕ ЖАДАЮЦЬ СПЯВАЦЬ ГІМН



Усе навучэнцы ўсіх адукацыйных установаў Славакіі павінны кожны панядзелак пачынаць навучальны тыдзень са спявання нацыянальнага гімна. Ім мусяць падпяваць таксама настаўнікі і прафесура. У кожным класе (уключаючы дзіцячыя садкі) павінен вісець нацыянальны сцяг і тэкст гімна. Гэта патрабаванні Закона аб абароне нацыянальных сімвалаў, які быў прапанаваны Нацыянальнай славацкай партыяй. Паколькі ад яе галасоў залежыць прыняцце законапраектаў, сацыял-дэмакраты, што зараз кіруюць краінай, ахвотна пайшлі нацыяналістам насустрач. Закон быў праведзены праз парламент і падпісаны прэзідэнтам. Між тым, супраць закона паўстала апазіцыя. Найперш, гэта венгры — самая вялікая этнічная меншасць у краіне (10 працэнтаў насельніцтва). З венграмі салідарныя… настаўнікі, перш за ўсё выкладчыкі ВНУ. На іх думку, фармальнае выкананне гімна хутчэй дыскрэдытуе сімвалы краіны. Гэтаму ёсць прыклад: у 1940–1950-я гады ў навучальных установах існаваў рытуал, падчас якога скандзіравалі прывітанне Сталіну. Магчыма, лёс супярэчлівага закона вырашаць вынікі парламенцкіх выбараў у чэрвені. Калі статус-кво ў парламенце захаваецца, нацыянальныя меншасці чакае новы ўдар. Нацыяналісты ўжо заявілі пра намер выдаць правільны школьны падручнік гісторыі краю.

**Па матэрыялах «El Pais» (Іспанія)**

### НАРВЕГІЯ. БЕЛАРУСЬ — НАРВЕЖСКІ ПРАТЭКТАРАТ

Нарвежскія калабарацыяністы шмат разоў прасілі нацысцкую Германію перадаць ім шэраг савецкіх тэрыторый. Гэта вынікае з упершыню апублікаваных дакументаў Нацыянальнага архіва Нарвегіі. Іх прадставілі публіцы ў сувязі з угодкамі ўварвання немцаў у Нарвегію 9 красавіка 1940 года. З дакументаў таксама вынікае, што партыя калабарацыяністаў «Нацыянальная згода» (Nasjonal Samling) марыла пашырыць тэрыторыю Нарвегіі за кошт Савецкага Саюза. Нарвежскія фашысты спачатку прасілі пратэктарат на тэрыторыяй у раёне Мурманска, але пасля жорсткай адмовы звярнулі свае позіркі на тэрыторыі сучасных Украіны і Беларусі. Міністры ўрада нават наведалі акупаваную Украіну з мэтай «заслупаваць» для сябе частку яе тэрыторыі. Больш таго: нарвежскі ўрад стварыў у Осла Рускае кіраванне і інстытут пад назвай «Austrveg» для ўвасаблення ў жыццё сваіх ідэй пра пашырэнне тэрыторыі. Тым не менш, кіраўнік СС Генрых Гімлер не быў зацікаўлены ў стварэнні нарвежскіх пратэктаратаў на тэрыторыі СССР і замест гэтага прапанаваў выкарыстоўваць нарвежцаў як «узброеных фермераў», якія дапамагаюць каланізаваць захопленыя землі.

**Па матэрыялах нямецкай прэсы**

### КІТАЙ. РОК-ЗОРКАМ УЕЗД ЗАБАРОНЕНЫ



Кітайскія кампетэнтныя органы адмовілі вядомаму спеваку Бобу Дылану ў візе. Спявак планаваў даць два канцэрты ў Пекіне і Шанхаі ў рамках свайго сусветнага туру. Каментуючы такое рашэнне, спецыялісты пішуць, што Дылан трапіў у чорны спіс музыкантаў, якім забаронена наведваць Паднябесную. У ім сёння таксама спявачка Б'ёрк, гурты «Oasis» і «Stones». Усе згаданыя выканаўцы і гурты правініліся перад КНР тым, што якімсьці чынам крытыкавалі пануючы ў краіне рэжым. Напрыклад, Б'ёрк у 2008 годзе падчас канцэрту ў Шанхаі закончыла свой выступ крыкам: «Тыбет!». Мясцовая прэса пазней асудзіла яе за абразу кітайскага народа, а ўлады ўнеслі ў спіс тых, каму забаронена наведваць КНР. А вось «Oasis» пазбавілі права даваць канцэрт з-за таго, што, як высветлілі кітайскія спецслужбы, у далёкім 1997 годзе лідэр гурта засвяціўся на сцэне, дзе вісеў транспарант «Свабоду Тыбету!». Што тычыцца Дылана, то яго віна, па словах тых жа экспертаў, у тым, што песня «Blowin' in the wind», якую ён выканаў у 1960-я гады ў падтрымку моладзевых пратэстаў, была адным з гімнаў студэнтаў, якія пратэставалі на плошчы Цяньаньмэнь роўна 20 гадоў таму.

**Па матэрыялах французскай прэсы**

ТРАГЕДЫЯ

# НОВАЯ ПОЛЬШЧА

**Алег НОВІКАЎ**



**Польшча перажывае адну з самых вялікіх трагедый у сваёй гісторыі. Такога кшталту катастрофы — гэта не толькі народны смутак, аднак таксама унікальны час, калі народ мяняе погляд на многія, здавалася, звыклыя рэчы.**




«Польшча адкрывае сябе наноў» — так называецца артыкул у нямецкай «Sueddeutche Zeitung», прысвечаны грамадскай атмасферы, якая склалася ў Польшчы пасля смаленскай трагедыі. Цяжка казаць, наколькі радыкальна Польшча зменіцца пасля 10 красавіка. Аднак нельга адмаўляць: нешта сапраўды адбывацца. Мяркуючы па дыскусіях на інтэрнэт-форумах і ў газетных артыкулах, ідзе гарачая палеміка па пытаннях, што вызначаюць нацыянальную канцэпцыю.

Па-першае, жудасная трагедыя падштурхнула людзей пераглядзець паўсядзённыя каштоўнасці, сваё месца ў свеце і жыццёвых мэты. Індывідуальны матэрыяльны поспех — здавалася, галоўны матыў паводзін людзей апошніх часоў — саступіў месца пошуку сябе ў калектыўнай тоеснасці. Асабістае разглядаецца праз прызму калектыўнага.

На форумах людзі задаюцца пытаннем: што мы за народ, палякі, у чым наша гістарычная місія? Вялікае месца ў гэтых дэбатах займае рэлігійны аспект і амаль дэманічны сімвалізм Катыні — месца, дзе два разы за 70 гадоў гінула эліта польскай нацыі.

Такое ўражанне, што шмат хто, асабліва маладыя людзі, упершыню адчулі прыналежнасць да нацыі. «Я плакала на плячы незнаёмай жанчыны. Мы з ёй нават абмяняліся папяровымі сурвэткамі, якія прапанаваў нам невядомы мужчына. Ён сам ледзь стрымліваў слёзы, аднак заклікаў: «Дзяўчаты, трымайцеся. Разам мы перажывем гэты цяжкі для Бацькаўшчыны час». І я зразумела, якая я шчаслівая, бо нарадзілася ў Польшчы», — напісана на адным з форумаў. У інтэрнэце вельмі шмат споведзяў такога кшталту.

Гэта высокая рыторыка, экзатычная ягшчэ ўчора, аднак нармальная цяпер, характэрная не толькі для звычайных людзей. «Сёння, сутыкнуўшыся з трагедыяй, наша нацыя застаецца аб'яднанай, адрозненні ў дэталях не маюць значэння. У гэты важны для краіны час мы разам», — заявіў спікер сейму Браніслаў Камароўскі, які выконвае абавязкі прэзідэнта краіны.

Менавіта ад апошняга і яго сябраў па партыі «Грамадзянская платформа» залежыць, ці стане цяперашні ўздым нацыянальнай свядомасці чымсьці большым за часовую калектыўную істэрыку.

10 красавіка здарылася не толькі трагедыя. Адбылася змена ўлады ў Польшчы. Фактычна зараз уся ўлада — і заканадаўчая і выканаўчая — апынулася ў руках «Грамадзянскай платформы».

У іншы час у падобных умовах платфармісты маглі б спакойна дзяліць пасады паміж сваімі. Аднак не ў Польшчы пасля 10 красавіка. Смаленская катастрофа пахавала былую партыйную логіку, калі партыі змагаліся за тое, каб прасунуць сваіх кандыдатаў на цёплыя месцы. Камароўскі вымушаны паводзіць сябе вельмі далікатна адносна апазіцыі, лідэры якой загінулі пад Смаленскам, — такое агульнае меркаванне грамадства.

Тым больш, праз пару месяцаў павінны адбыцца прэзідэнцкія выбары. Гэта будуць унікальныя выбары ў гісторыі краіны. Смаленская трагедыя папросту не дазволіць пускаць у ход старыя прыёмы міжпартыйнай барацьбы: капацца ў бруднай бялізне апанента, шукаць на яго кампрамат і г.д. Гэта, на думку шматлікіх газет, дае унікальны шанс для нараджэння ў Польшчы новай палітычнай культуры.

Важная дэталь — перагляд стаўлення да Леха Качыньскага як да чалавека і палітыка. Што хаваць — Качыньскі быў непапулярным прэзідэнтам. Ягоныя кансерватыўныя і клерыкальныя забабоны, штодзённыя звароты да мінулага выклікалі ў лепшым выпадку смех з боку прадстаўнікоў ліберальнага і левага лагера. Аднак чалавечае вымярэнне таго, што адбылося 10 красавіка, разумення хуткасці жыцця, элементарная чалавечая салідарнасць прымусілі нават заўзятых апанентаў Леха Качыньскага па-новаму паглядзець на ягоную асобу і спадчыну.

Шмат хто пачувае сябе няёмка за тое, што ставіўся настолькі нядобразычліва да думкі апанента. Замест таго, каб зразумець учынкі чалавека, папросту запісваў яго ў катэгорыю кансерватараў і рэтраградаў.

Нарэшце, мяняецца і стаўленне да Расіі. Нельга казаць пра тое, што догмы, якія фармаваліся як мінімум 200 апошніх гадоў, цалкам пахаваныя. На тых жа форумах хапае нататак пра тое, што за аварыяй стаялі людзі з Лубянкі. Матывы называюцца розныя: ад простай гістарычнай помсты да жадання падабраць на месцы аварыі ноўтбукі лідэраў Польшчы, якія ўтрымліваюць дзяржаўныя сакрэты.

Аднак лёд у гэтым накірунку, здаецца, парушыўся. «Расіяне ў прынцыпе трымаліся вельмі добра. Вядома, што палітычныя інтарэсы засталіся, аднак галоўнае — тое, што яны паводзілі сябе надзвычай чалавечна. Вельмі хацелася, каб мы пачалі трактаваць Расію як цяжкага, аднак партнёра і суседа, а не крыніцу вялікага зла», — піша адзін з удзельнікаў форума на сайце выдання «Gazeta Wyborcza».

«Катынь як месца польска-расійскай варожасці можа цяпер стаць сімвалам яднання паміж народамі», — піша тая ж «Gazeta Wyborcza».

З гэтым пагаджаецца і кансерватыўная газета «Rzecz Pospolita». Яна цытуе расійскага публіцыста Сяргея Бутмана: «Рэакцыя Расіі на трагедыю дэманструе, наколькі штучнымі былі праблемы. Злучыў нас смутак. Расійскія лідэры знайшлі аўтэнтычныя шчырыя словы. Я не пачуў фальшывай ноткі».

«Polski Dziennik Zachodni» цытуе Нормана Дэвеса: «Думаю, што Катынь будзе асабістым катарсісам для ўсяго рускага народу. Гучыць гэта дзіўна, аднак польскі катарсіс дазваляе расіянам вызваліцца ад асабістых фантомаў мінулага».

І ён мае рацыю. «Независимая газета» ў каментары на смерць Качыньскага піша: «У СССР таких сваіх «Катыней» было тысячы, і ахвяр — больш. І нават Катынскій лес захоўвае памяць не толькі пра польскіх, але таксама і пра рускіх расстраляных, рэпрэсаваных, загінулых і да пачатку Вялікай Айчыннай, і пасля яе. І, як ні сумна ўсведамляць, пра іх успомнілі ў тым ліку і дзякуючы настойлівасці палякаў».

Парадокс, аднак, магчыма, выкліканая падзеямі 10 красавіка дыскусія ў Расіі наконт сталінскіх рэпрэсій стане таксама фактарам станаўлення новай Польшчы.

МЕРКАВАННЕ

# ВЕЦЦЕ НАД СМАЛЕНСКАМ

Ева ВАЙТОЎСКАЯ

**Авіякатастрофа 10 красавіка скаланула Польшчу, Расію і ўсіх сяброў і суседзяў польскага народа. Усе мы стаім перад неабходнасцю асэнсаваць трагедыю, што адбылася. Для польскіх інтэлектуальных колаў гэты працэс асабліва няпросты.**

Лех Качыньскі быў прэзідэнтам хутчэй пенсіянераў і простага народа, не маючы сярод студэнцтва і прагрэсіўных элітаў ані каліва падтрымкі. Больш за тое, браты Качыньскія, лідэры кансерватыўнай партыі «Права і справядлівасць», былі аб'ектам кпінаў ліберальнага насельніцтва з вышэйшай адукацыяй — сябры «ПіС» нават прыдумалі для іх мянушку — «адукаванцы». «Адукаванцы» ў адказ складалі крыўдныя анекдоты пра качак і галасавалі на парламенцкіх выбарах за Дональда Туска.

І вось новай трагедыяй абярнулася гадавіна трагедыі ў Катыні, якая была цэнтральнай часткай рыторыкі польскай улады і навязла простым палякам на зубах не менш, чым беларусам педаляваны нашым рэжымам подзвіг народа ў часы Вялікай Айчыннай. Новая трагедыя ўсё перавярнула.

Гібель польскай эліты на расійскай зямлі выклікала суперажыванне і многіх расіянаў. У той жа дзень адгукнуўся на падзенне самалёта вершам-рэквіемам малады паэт з Масквы Леў Аборын. З ім, а таксама з мэтрам польскай паэзіі Багданам Задурам я і гутару.

**Багдан ЗАДУРА: «Палітычныя сімпатыі страцілі значэнне»**

***— Польскія інтэлектуалы не надта любілі братоў Качыньскіх. Што змянілася пасля крушэння самалёта 10 красавіка?***

— Праз некалькі дзён пасля трагедыі ў Смаленску мне ўсё яшчэ цяжка паверыць у тое, што адбылося. З самай першай хвіліны палітычныя сімпатыі страцілі значэнне. Мне аднолькава шкада тых загінулых, чыю дзейнасць я ўхваляў, і тых, хто не выклікаў майго энтузіязму.

***— Ці адчуваеце, што мела месца «другая Катынь», як пра гэта часам пішуць?***

— Цяжка было, дазнаўшыся пра катастрофу, у першую хвіліну не падумаць пра нейкі пачварны жарт гісторыі, пра абсурдную іронію лёсу, пра метафізічны маштаб гэтага здарэння. Пра тое, што менавіта там, менавіта тады. Што ў 70-ю гадавіну катынскай разні загінулі людзі, якія ляцелі, каб ушанаваць памяць яе ахвяраў. Гэтак жа, як тады эліта польскага народа загінула ад куляў НКУС, цяпер падчас катастрофы гіне значная яе частка.

***— Якія высновы можна зрабіць ужо цяпер?***

— Шукаць дабра ў няшчасці?.. Да галавы прыходзяць дзве думкі. Першая адносна прэзідэнта, які ўваходзіць у гісторыю Польшчы як трагічная постаць, і такім застанецца ў ёй назаўжды. Калі б не гэта смерць, яго кіраванне ніякім чынам не знайшло б пазітыўнага адбітку ў калектыўнай памяці, прынамсі, у ладным кавалку гэтай памяці. Я не быў прыхільнікам яго гістарычнай палітыкі, яна здавалася мне анахранізмам. Але ж парадокс: загінуўшы пад Катынню, ён дасягнуў адной з са сваіх галоўных мэтаў: пра Катынь і сапраўды даведаўся ўвесь свет.

Другая думка тычыцца польска-расійскіх адносін, на якіх цягам апошніх 70 гадоў адкідвала густы цень катынская трагедыя. Парадаксальным чынам няшчасце польскага народа, якое зноў здарылася на расійскай зямлі, можа стаць вялізным крокам для польска-расійскага прымірэння, да пераадолення варожасці і перадузятасці. Пасля гора, што здарылася, палякі пабачылі чалавечнасць Уладзіміра Пуціна і Дзмітрыя Мядзведзева, пабачылі простых расіян, якія падзяляюць з імі гэты боль. Думаю, што гэтага палякі ў сваёй пераважнай большасці не забудуць.

**Леў АБОРЫН: «Добра было б, калі б спагада перастала здзіўляць»**

***— Якія эмоцыі прымусілі вас напісаць верш?***

— Эмоцыі — гэта, вядома ж, шок, агаломшанасць, спачуванне, якія я перажыў, даведаўшыся пра крушэнне самалёта. Шакавала і гібель стольскіх людзей, і колькасць супадзенняў, і гора палякаў, і страх страціць лучнасць з Польшчай. Я быў там двойчы, апошнім разам зусім нядаўна, напрыканцы сакавіка, на канферэнцыі ў Варшаве. Там нас цудоўна прымалі, я пасябраваў з некаторымі людзьмі, маладымі польскімі навукоўцамі, што даследуюць рускую літаратуру. Два гады я вывучаў мову, пераклалаў польскую паэзію. Польшча — важная частка майго жыцця. Думаю, гэта горыч паглыбіла сувязь з краінай.

***— Мы былі шакаваныя хваляй злацешнасці, што ўзнялася пасля трагедыі на некаторых расійскіх блогах. Як вы думаеце, з чым яна звязаная?***

— Мяне такая рэакцыя таксама заўжды жахае, і гэтым разам таксама. Але я бачыў і іншую: бачыў шчырае гора і спачуванне. І гэтага болей. Папросту спачуванне ў такіх выпадках — норма, а мэта мярзотных скокаў на касцях відавочная — быць больш заўважным. Часткова гэта — «тролі», якім няма справы ні да Польшчы, ні да Расіі, часткова — нягеглыя людзі, у якіх у галаве жывуць патэрны страху і варажнечы. Гэта можа тычыцца як людзей, якія любяць статкавую арганізацыю, так і нібыта разумных, але насамрэч — гэткіх жа. Звярніце ўвагу: у прыстойных месцах (у інтэрнэце ж ёсць прыстойныя месцы!) такія выказванні сустракаюць адлуп.

***— Што будзе: сяброўства паміж краінамі ці нешта іншае?***

— Спадзяюся, усё ж такі сяброўства. Я чытаў польскія інтэрнэт-выданні, там шмат водгукаў, на жаль, здзіўленых: палякі не чакалі ад расіянаў такой хвалі цяпла і падтрымкі. Добра было б, калі б спагада перастала здзіўляць. І, галоўнае, вядома ж, сяброўства не паміж урадамі, а паміж народамі. Мушу сказаць, што ні разу не сустракаў ні ў Польшчы, ні тут у дачыненнях з палякамі ніякай варожасці. Тое ж пра Украіну і Эстонію, з якімі ў нас афіцыйна нацягнутыя стасункі. Насамрэч гэтага няма — або прынамсі не больш, чым у нас саміх. Гэта пытанне ўзаемнага жадання, адкрытасці, а не прапаганды і гарадскіх легендаў.

**Лев Оборин**

* * *

над Смоленском тучи ходят хмуро
стонет металлическая груда
хлопья металлического снега

для чего ты здесь, литература
как предупреждение оттуда
для чего dlaczego

что за крылья за твоей спиною
тяжестью висящею, стальною
угол дьявольски сочтен и найден

с так и не избытою виною
смотрим кинопленку жизнь длиною
от луны до Вайды

вот второе время, о котором
судят в выражении словесном
но не говорим об этом месте

чувствуем спиной и видим скорым
спутником, как ветви
над Смоленском
образуют перекрестье

**10 апреля 2010 г.**

**Даведка:**



**Багдан ЗАДУРА** (нарадзіўся ў 1945 годзе), польскі паэт, празаік, крытык, перакладчык літаратуры. Галоўны рэдактар часопіса «Творчасць». Жыве ў Пулавах.



**Леў АБОРЫН** (нарадзіўся ў 1987 годзе) — расійскі паэт, перакладчык, крытык. Аспірант РДГУ. Жыве ў Маскве.

## ПАЛІТЫКІ ТЫДНЯ

### ДАНІЭЛЬ АРТЭГА



Прэзідэнт Нікарагуа, лідэр Фронту нацыянальнага вызвалення, дэманструе цуды геапалітычнай эквілібрыстыцы. Пасля перавароту ў Гандурасе ў чэрвені 2009 года, як вядома, Нікарагуа, як і іншыя краіны Лацінскай Амерыкі, стала на бок легітымнага прэзідэнта. Між тым, пакуль аднаўлення канстытуцыйнага ладу ў Гандурасе не назіраецца. Путчысты правялі выбары, на якіх перамог Парфірыа Лоба Соса. Аднак лідэры краін Лацінскай Амерыкі яго не прызналі, найперш таму, што не хочуць зноў уводзіць у актыўнае палітычнае жыццё рэгіёна практыку вайсковых пераваротаў. Прарыў у дыпламатычнай блакадзе Гандураса зрабіў Даніэль Артэга. Ён пагадзіўся сустрэцца з Парфірыа Лоба. Апошні прыляцеў у Манагуа ў мінулую пятніцу, праўда, як прыватная асоба. Такі статус не перашкодзіў яму быць прынятым у штаб-кватэры кіруючай партыі. Больш таго, прыватная асоба падпісала з лідэрам Нікарагуа шэраг дамоваў. Навіна выклікала шок у Лацінскай Амерыцы. Сам Артэга кажа, што размаўляў з Парфірыа выключна пра памежныя праблемы. Між тым, у самім Гандурасе хунта п'е шампанскае. Гэта першая сустрэча новага кіраўніка краіны на міжнародным узроўні, якая, на іх думку, пакладзе пачатак прызнання рэжыму.

### АЛЕНА БАБІЧ



Дэпутат гарадскога савету Санкт-Пецярбурга ад ЛДПР праславілася тым, што, па яе словах, выгнала прывід са сцен Марыінскага палацу. Гэта загадкавая гісторыя стварыла ёй імідж галоўнага змагара з нячыстай сілай на берагах Нявы. Цяпер Бабіч праславілася яшчэ і як абаронца інтарэсаў падаткаплацельшчыкаў, на грошы якіх жывуць дэпутаты. Усё пачалося, калі фракцыя «Справядлівай Расіі» прапанавала абвясціць 12 снежня (дзень прыняцця ў 1993 годзе Канстытуцыі Расіі) непрацоўным днём. Дзень Канстытуцыі павінен быў, па словах дэпутатаў, замяніць у чырвоным календары 4 лістапада, калі расіяне святкуюць Дзень адзінства нацыі. На самай справе, 4 лістапада стаў хутчэй днём раз'яднання: у гэты дзень правыя арганізуюць акцыі супраць этнічных меншасцяў. Прапанова выклікала гарачыя дэбаты, якія яўна пераходзілі мяжу. Парадак вярнула дэпутат Бабіч. Яна выйшла на трыбуну і заявіла: «Ну давайце не марнаваць дарагі час і грошы нашых выбаршчыкаў на ўсякую, выбачайце, х...рню!» Словы жанчыны ацвярозілі дэпутатаў. Некаторыя нават пачалі апладзіраваць. Пытанне пра святочныя дні адклалі. Выраз Алены Бабіч пра «х...рню», між тым, меў цікавыя наступствы. Дэпутаты ад «Справядлівай Расіі» заявілі, што больш не вераць, нібыта Бабіч выганяла злых духаў. Па іх словах, такая асоба слова на літару «х» ужываць ніколі не будзе.

### ЖАН-МАРЫ ЛЕ ПЭН

81-гадовы лідэр французскай партыі «Нацыянальны фронт» заканчвае палітычную кар'еру. У інтэрв'ю «Le Figaro» ён паведаміў, што не будзе балатавацца ў прэзідэнты Францыі ў 2012 годзе. Тым не менш Ле Пэн сыходзіць на пенсію ў статусе паспяховага палітыка. Ён вывеў «Нацыянальны фронт» у парламент, а ў 2002 годзе на прэзідэнцкіх выбарах нават здолеў абыйсці кандыдата ад сацыялістаў і выйсці ў другі тур, дзе прайграў Жаку Шыраку. Акрамя таго, ён пакідае партыю ў дастаткова добрым стане. «Нацыянальны фронт» вяртае свае пазіцыі. На сакавіцкіх рэгіянальных выбарах партыя атрымала 17 працэнтаў. Адстаўка Ле Пена, аднак, можа выклікаць канфлікт унутры партыі. Дасюль ідуць спрэчкі наконт пераемніка цяперашняга лідэра. Галоўныя кандыдатуры дзве — дачка Ле Пэна Марына і Бруна Галніш. Апошні вядомы шэрагам скандальных заяваў. Так, Бруна ў свой час сцвярджаў, што суд над Клаўсам Барб'е (былы шэф ліёнскага Гестапа) — «пастановачны спектакль».



▶ ФЕСТЫВАЛЬ

# НЕЎПАРАДКАВАНЫ «ПАРАДАК СЛОВАЎ»

## «КАРАЛЁМ ПАЭТАЎ» НА РУСКА-БЕЛАРУСКІМ ФЕСТЫВАЛІ БЫЎ АБРАНЫ ЎКРАІНЕЦ

Алесь ГІНЗБУРГ

**9–11 красавіка ў Мінску адбыўся чацвёрты па ліку фестываль паэзіі «Парадак словаў». Цягам трох дзён наведнікі галерэі «Ў» мелі магчымасць слухаць вершы з Гродна, Полацка, Магілёва, Гомеля, Кіева, Мінска, Масквы, Санкт-Пецярбурга.**

Сёлетні, чацвёрты па ліку, фестываль «Парадак словаў» выклікаў у мяне падвоеныя пачуцці. Што да пазітыўнай іх часткі, то яны, безумоўна, былі звязаныя з адкрыццём фестывалю 9 красавіка ў галерэі «Ў». Найперш таму, што пасля доўгага перапынку, ці ўвогуле ўпершыню, я меў шанец пачуць знаёмых адно паводле публікацыяў нямінскіх паэтаў Беларусі: Юрыя Гуменюка і Анатоля Брусевіча з Гродна, Югасю Каляду з Гомеля, Леру Сом з Полацка, Дзмітрыя Дзмітрыева з Магілёва.

Трымалі планку і паэты, якія жывуць у Мінску і часта выступаюць перад публікай: Уладзімір Арлоў, Віталь Рыжкоў, Дзмітры Строцаў, Вольга Залеская, Андрэй Хадановіч, прэзентацыяй кнігі «Несіметрычныя сны» якога скончыўся вечар. Што да расійскіх гасцей фестывалю, то іх амаль не было (пятніца ў Маскве — дзень працоўны). Так што адкрыццё выдалася хутчэй беларускім, чым расійскім ці ўкраінскім — замежныя госці падцягнуліся адно ў суботу.

У наступныя дні мне давялося пабачыць не ўсе акцыі, і не ўсе акцыі атрымалася паглядзець цалкам, таму коратка апішу тыя, якія запомніліся найяскравей.

Чытанні перакладной паэзіі далі наведнікам магчымасць пачуць вершы польскіх паэтаў Збігнева Герберта і Віславы Шымборскай, грузінскага паэта Гагі Нахуцрышвілі і амерыканскага Тэйлара Мэлі па-беларуску. Вера Бурлак прадстаўляла свой пераклад «Скрозь люстэрка...» Льюіса Кэрала, а Павел Анціпаў чытаў пераклады вершаў Віктара Жыбуля на рускую мову.



Дмытро Лазуткін

На імпрэзе «Паэзія не для ўсіх» з заяўленых у анонсе аўтараў выступалі толькі Андрэй Адамовіч і вядучы імпрэзы Ігар Бабкоў. Вершы Алега Мінкіна, Алеся Разанава і некаторых іншых паэтаў, ідэйна блізкіх да серыі кніг «Галерэя Б», можна было паслухаць у выкананні ўдзельнікаў фестывалю, якія былі ў залі. Гледачы шапталіся, што нехта бачыў у натоўпе цень Міхася Баярына, але легенда герметычнай паэзіі канца 1990-х для чытанняў так і не матэрыялізавалася. «Паэзія не для ўсіх — гэта такая незразумелая нам, недалёкім, штука, што аўтар нават не бачыць сэнсу ў там, каб прыходзіць на чытанні», — зрабілі выснову прысутныя. Аматараў «паэзіі не для ўсіх» у «Кнігарню Ў галерэі», трэба сказаць, набілася пад завязку.

Цэнтральнай падзеяй фестывалю стала вечарына ў кавярні «Валерыя», падчас якой адбываліся выбары «Караля паэтаў». Турнір паэтаў ладзіўся па правілах срэбнага стагоддзя: удзельнікі дэкламавалі вершы на абвешчаныя перад пачаткам тэмы, адзнакі ў бюлетэні выстаўляла прафесійнае і глядацкае журы. Што праўда, нягледзячы на дэклараваную повязь часоў, журы — а менавіта яны судзілі першы тур — найбольш цанілі ў аўтарах актуальнасць, сучаснасць і навізну. Можа, менавіта таму са свістам праляцелі міма фіналу беларускія паэты, адзін з якіх прысвяціў верш Ігару Севяраніну, а другі — Уладзіміру Маякоўскаму, зацятым супернікам на турнірах паэтаў у Пецярбургу пачатку XX стагоддзя. Трэцяе месца ў спаборніцтве заняла Марыя Мартысевіч, другое — Віталь Рыжкоў. Каралём жа паэтаў, па прызнанні мінчукоў, стаў кіянін Дмытро Лазуткін. Украінская мова яго пранікліва вершаў пра каханне не толькі не зашкодзіла, але мо' і дапамагла яму перамагчы.

Імпрэза «8 жанчынаў» прадставіла творчасць расійскай арт-групы «Баб/Ищи», у якую, па словах ідэйнай лідэркі Дар'і Сухавей, уваходзяць «жанчыны з актыўнай жыццёвай пазіцыяй, якія пішуць вершы». Выступалі маскоўскія паэткі Марына Хаген, Юлія Скарадумава, Ганна Галубкова. Беларусі бок прадстаўлялі «вядомыя невядомыя» паэткі: гісторык Вольга Бабкова, празаік Югася Каляда, крытык Маргарыта Аляшкевіч, якая кідалася ў залю ірыскамі і калаціла гліняную талерку, спісаную вершамі, на аскепкі (аскепкамі, на шчасце, кідацца не стала). Завяршылі чытанні маладыя паэткі-пераможцы літаратурнага конкурсу ПЭН-цэнтра Кацярына Зыкава і Алеся Башарымава.

Асобна спынюся на ўзроўні арганізацыі руска-беларускага фестывалю. Гладка, без затрымак і збояў прайшоў толькі галаканцэрт фестывалю 9 красавіка. Гледачы, якія збіраліся паслухаць вершы ў апошнія два дні «Парадку словаў», сутыкаліся з арганізацыйнай расхлябанасцю, якая многіх з іх абражала і прымушала «галасаваць нагамі». Каардынатары фестывалю не маглі адшукаць адно аднаго нават па мабільных, чытанні пачыналіся са спазненнямі, калі пачыналіся ўвогуле. Не было ясна, да каго звяртацца па інфармацыю, хто, уласна, «виноват» і «что делать». Усё гэта рабіла на старонняга назіральніка не найлепшае ўражанне.

Аўтар гэтых радкоў усведамляе: ён піша пра падзею, якая, хоць і мае статус міжнароднай, насамрэч з'яўляецца прыватнай ініцыятывай некалькіх энтузіястаў. Але відавочна: «Парадку словаў» патрэбная сталая пляцоўка, фінансаванне, актыўная каманда арганізатараў як з беларускага, так і з расійскага боку (гэтым разам шчыраваў толькі наш бок: Беларускі ПЭН-цэнтр на базе галерэі «Ў» пры падтрымцы кампаніі «Будзьма беларусамі!»). Пакуль такіх умоваў няма, выдатная ідэя чым далей, тым болей дыскрэдытуецца да болю непрафесійным выкананнем. Чатыры гады фестывалю паказваюць: у другі раз расійскія паэты ў Мінск не вяртаюцца. «Парадак словаў», вядома ж, цудоўная нагода пазнаёміць расійскіх сяброў па пяры з чыстым Мінскам і яго гасціннымі жыхарамі... Але, ведаеце, часам хочацца пачуць і паэзію.

▶ КНІГАРНЯ

# «БЕЛАРУСКАЯ ДЫЯСПАРА Ў ВЯЛІКАБРЫТАНІІ — З'ЯВА УНІКАЛЬНАЯ»

**Як фарміравалася, чым была і чым ёсць сёння беларуская эміграцыя, у чым асаблівасці беларускага жыцця ў Вялікабрытаніі. Пра гэта і іншае распавядае напярэдадні прэзентацыі ў Лондане аўтар кнігі «Беларусы ў Вялікабрытаніі», гісторык Наталля Гардзіенка.**

— Ідэя напісання кнігі нарадзілася ў саміх брытанскіх беларусаў, і недзе ў 2003 годзе яны звярнуліся да ЗБС «Бацькаўшчына» з просьбай дапамагчы з пошукам аўтара. У той час я працавала над кнігай пра беларускае жыццё ў Аўстраліі і, фактычна, толькі пачала цікавіцца гісторыяй беларускай эміграцыі. З 2005 года распачалася вялікая праца па вывучэнні архіву Згуртавання беларусаў у Вялікабрытаніі (ЗБВБ), дакументаў Бібліятэкі імя Ф. Скарыны ў Лондане і іншых матэрыялаў. І вось праз пяць гадоў нарэшце пабачыла свет кніга.




Працаваць над ёй было цікава і складана. З аднаго боку, матэрыялаў было даволі шмат, аднак, як аказалася, яны асвятлялі далёка не ўсе моманты беларускага жыцця ў Вялікабрытаніі. Давялося адмыслова шукаць матэрыялы пра некаторыя арганізацыі, што не мелі непасрэднай сувязі з ЗБВБ, як, прыкладам, Беларускі Вызвольны Рух, Беларускі Вызвольны Фронт. Вельмі цікавілі мяне беларускія могілкі, інфармацыю пра якія давялося шукаць спецыяльна. Не ўсё, што задумвалася ад пачатку, удалося рэалізаваць, бо насамрэч немагчыма аказалася ў адной кнізе распавесці пра ўсё. Па-за даследаваннем засталіся некаторыя аспекты беларускага жыцця, якія яшчэ чакаюць вывучэння, і найперш уласна жыццё звычайных беларусаў у Брытаніі, іх досвед сацыяльнай адаптацыі, іх штодзённасць. Гэта вялікая і сур'ёная тэма, вартая адмысловай увагі.

Мяне ўразіла колькасць і разнастайнасць беларуска-брытанскіх кантактаў да XX стагоддзя. Захаваліся сведчанні вандроўнікаў і дыпламатаў, адмысловыя беларускія выданні, што пабачылі свет у Лондане ў XIX — пачатку XX стагоддзя. Цікава было даведацца пра складанасці жыцця вялікай хвалі эканамічнай эміграцыі з беларускіх земляў на мяжы XIX—XX стагоддзяў, прадстаўнікі якой, прыкладам, у Лондане сяліліся ў раёне порта.

Шмат цікавага звязана з паваеннай эміграцыяй: як з дзейнасцю ЗБВБ, яго рэгіянальных структураў, Беларускіх дамоў у Лондане, Манчэстэры і Брэдфардзе, гэтак і з працай іншых арганізацый.

Варта адзначыць Англа-Беларускае таварыства, заснаванае ў 1954 годзе супольна беларусамі і брытанцамі-арыстакратамі, з ініцыятывы якога святкаванні ўгодкаў абвяшчэння незалежнасці БНР рэгулярна адбываліся ў Брытаніі на самым высокім узроўні, у тым ліку і ў Парламенце.

Унікальным праектам, які быў рэалізаваны ў Лондане, стала дзейнасць школы-інтэрната для хлопцаў імя Кірылы Тураўскага. Тут пад апекай Беларускай каталіцкай місіі ўсходняга абраду ў 1960–1970-х гадах жылі і навучаліся дзеці беларусаў. Хлопчыкі прыкладна ад 8 гадоў не толькі атрымоўвалі ўласна брытанскую адукацыю ў звычайных лонданскіх школах, але і вывучалі беларускую літаратуру, гісторыю і мову, каб здаваць адмысловыя іспыты па беларускай мове на атэстат сталасці ў Лонданскім універсітэце.

Цікава было даведацца і пра дзейнасць спецыяльнай беларускай паштовай службы на пачатку 1970-х у часе паштовага страйку ў Вялікабрытаніі. Яна нават выпусціла серыю беларускіх марак.

Беларуская дыяспара ў Вялікабрытаніі — з'ява унікальная на Захадзе. Яна арганізацыйна стала афармляцца бадай што раней за іншыя пасляваенныя беларускія асяродкі ў свеце. Асноўнымі рухавікамі грамадскага жыцця тут сталі не перамешчаныя асобы (Ды-Пі), а былыя вайскоўцы, жаўнеры Арміі Андэрса, і гэтая акалічнасць шмат у чым паўплывала на характар тых арганізацый, што ствараліся ў Брытаніі беларусамі.

Цікавай асаблівасцю беларускага жыцця ў Брытаніі стала тое, што тут у пэўны час было даволі шмат будынкаў ва ўласнасці беларускіх арганізацый. Толькі ЗБВБ мела тры грамадскія дамы (у Лондане, Манчэстэры і Брэдфардзе), свой дом у Лондане таксама некаторы час мела Хрысціянскае аб'яднанне беларускіх работнікаў, чатыры будынкі ў Паўночным Фінчлі складалі беларускі культурна-грамадскі цэнтр пад апекай Беларускай каталіцкай місіі ўсходняга абраду. Тут размяшчаўся не толькі святарскі дом з капліцай, але і будынкі згаданага вышэй інтэрнату імя Кірылы Тураўскага, а таксама Беларускай Бібліятэкі імя Ф. Скарыны. І гэта ўсё была менавіта грамадская беларуская ўласнасць у Вялікабрытаніі, якая выкарыстоўвалася на патрэбы арганізацый.

Важнай адметнасцю беларускага жыцця ў Брытаніі, мне здаецца, было тое, што нашы суайчыннікі здолелі тут не проста завязаць шчыльныя кантакты з брытанцамі, у тым ліку прадстаўнікамі арыстакратыі, але і зацікавіць у вывучэнні беларускай літаратуры і гісторыі навукоўцаў. Вялікую ролю ў гэтым адыграла Беларуская бібліятэка імя Ф. Скарыны, што стала цэнтрам прыцягнення беларусістаў з розных краінаў свету.

Кнігу «Беларусы ў Вялікабрытаніі» можна набыць у наступных крамах:

«Кнігарня пісьменніка», вул. Казлова, 2, тэл.: 2849061, www.pism.belkniga.by

«Акадэмкніга», пр. Незалежнасці, 72, тэл.: 2920052

«Кнігарня «Эўрыка», вул. Куйбышава, 75, тэл./факс: 2920067, www.evrica.belkniga.by«

Сядзіба ТБМ, вул. Румянцава, 13, тэл.: 2848511, www.tbm.org

Управа БНФ, вул. Варвашэні, 8, тэл.: 2133008, 2845012, www.pbnf.org

«Дом книги «Знание», вул. К. Маркса, 36, тэл./факс: 2261090, www.znanie.belkniga.by

КнігарняЎгалерэі, пр. Незалежнасці, 37А, тэл. 2906306, www.ygallery.by

Крама «Подземка», пр. Незалежнасці, 43

**Паводле прэс-службы ЗБС «Бацькаўшчына»**

ПРЭЗЕНТАЦЫЯ

# ГІТАРЫ СВАБОДЫ

Анатоль МЯЛЬГУЙ

**9 красавіка ў сталічным Палацы мастацтваў адбылася прэзентацыя фанаграфічнага праекта «Барды Свабоды», які прэтэндуе стаць анталогіяй сучаснай беларускай бардаўскай песні як па тэматычнаму, так і па кампазіцыйнаму ўвасабленню твораў айчынных выканаўцаў. Выданне стала магчымым дзякуючы падтрымцы «Радыё Свабода» і з'яўляецца чацвёртым па ліку дыскам, выдадзеным гэтай радыёстанцыяй. Нагадаю, што першым у гэтым шэрагу стаў аўдыёдыск «Быкаў на Свабодзе», на якім гучыць голас вялікага пісьменніка, а таксама два тамы анталогіі беларускай паэзіі «Начная чытанка». І вось новы падарунак, на гэта раз аматарам бардаўскай песні.**



Зміцер Сідаровіч

Фота аўтара



Кастусь Герашчанка



Яраш Малішэўскі



Таццяна Беланогая



Андрэй Хадановіч



Аляксандр Вашчанка і Анатоль Кудласевіч

У інтэрв'ю нашаму выданню вядучы перадачы «Барды Свабоды» знакаміты беларускі бард Зміцер Бартосік адзначыў: «Сёння мы прэзентуем мультымедыйнае выданне «Барды Свабоды». Праграма з аналагічнай назвай выходзіць на «Радыё Свабода» з верасня 2008 года. На яе хвалях прагучалі кампазіцыі ўжо каля сотні аўтараў. І што вельмі прыемна, толькі беларускамоўных. Я сам не чакаў, што ў нас столькі цікавых аўтараў, якія спяваюць на роднай мове! Таксама для мяне было адкрыццём, што ўсё больш моладзі выконвае беларускія песні. Праўда, з большага яны гучаць па «кватэрніках» ці ў клубах. І вось нарэшце многіх з іх удалося сабраць на дыску «Барды Свабоды» пад адной вокладкай, у адной канцэртнай праграме на гэтай прэзентацыі. Калі б мне гадоў дзесяць таму сказалі, што ў Беларусі будзе больш за сотню беларускамоўных аўтараў, а іх песні можна было б змясціць на адзін дыск, то я б не паверыў! І вось сёння мы будзем прадстаўляць беларускім слухачам першы том анталогіі сучаснай бардаўскай песні. А гэта 50 аўтараў, якія запісалі па 5 песень. Усе гэтыя творы гучалі на працягу года».

Прэзентацыю дыска «Барды Свабоды» распачалі сваімі ўступнымі словамі кіраўнік беларускай службы «Радыё Свабода» Аляксандр Лукашук, які, дарэчы, упершыню дэбютаваў як бард, а таксама вядучы «Бардаў Свабоды» Зміцер Бартосік. Зміцер перадаў эстафету прэзентацыі першаму ўдзельніку канцэртнай праграмы — барду Зміцеру Сідаровічу. Зміцер узгадаў нашы з ім даўнія размовы пра неабходнасць выдання сольнага дыска і паведаміў слухачам, што яго дэбютная праца пад назвай «Дзіцячы альбом» ужо падрыхтаваная да выдання. Музычная частка выступу Сідаровіча складалася з песень, якія даволі шырока вядомыя беларускім слухачам. Адна з іх — «Пена цёмнага піва» — была, як заўсёды, прынята з вялікім энтузіязмам.

Яраш Малішэўскі, наступны ўдзельнік прэзентацыі, аддаў перавагу класічным вершам Ларысы Геніюш. Прыхільнасць да іх у Яраша ідзе яшчэ з праекта «Ларыса Геніюш. Жыць для Беларусі». Адзначылі бурнымі воплескамі слухачы і лірычны твор Яраша «Любая Марына».

Вядомы рок-бард Юрый Несцярэнка ў сваёй творчасці больш схіляецца да блюзавых і рок-н-рольных інтанацый. Гэтым крытэрыям адпавядала кампазіцыя «Агні гарацъ» на верш Л. Рублеўскай. На прэзентацыю Юрый прыйшоў таксама не з пустымі рукамі: пабачыў свет «жывы» альбом з блюзавымі стандартамі і кампазіцыямі Несцярэнкі і яго гурта «White Night Blues» пад назвай «Live in Poland».

Своеасаблівым падарункам слухачам стала выступленне паэта і барда Андрэя Хадановіча, які ўразіў наведвальнікаў прэзентацыі дасціпным сцёбам і постмадэрнісцкай метафарычнасцю, якая буяла ў яго кампазіцыях паводле сусветнавядомых эвергрынаў. Так, Андрэй стварае свае песні на матывы мелодый Эдзіт Піяф ці хітоў, кшталту «Besame mucho». Але гэта не перашкаджае яму напаўняць сусветнавядомыя мелодыі





знаёмымі рэаліямі, як гэта можна было адчуць у фантазіі на тэму песень Тота Кутуньё і Аляксандра Ярмоленкі «Італьянскі базар».

Адзін з пачынальнікаў беларускамоўнага бардаўскага руху паэт і выканаўца Анатоль Кудласевіч вядомы тым, што, працуючы ў Саюзе пісьменнікаў, стаў арганізатарам першага беларускамоўнага бардаўскага фестывалю, які адбыўся ў 1993 годзе. Той час Анатоль нагадаў сваімі кампазіцыямі, якія прагучалі ў яго выкананні. Перад усім, знакамітымі з часоў першых бардаўскіх фэстаў «Атрасінамі» на верш паэта-вязня Славаміра Адамовіча. Кудласевіч прапанаваў таксама новыя кампазіцыі, якія, магчыма, хутка ўвойдуць у трэкліст першага альбома барда.

Кастусь Герашчанка, кіраўнік спеўнага гурта «Пліса» з аднайменнага беларускага мястэчка Глыбоцкага раёна Віцебскай вобласці, вядомы не толькі на сваёй малой радзіме, але і ў сталіцы. Бо Кастусь і яго калегі па гурту — частыя госці на мінскіх канцэртных пляцоўках, яго творы гучаць на хвалях беларускага радыё, а сам Кастусь з цягам часу зрабіўся актыўным удзельнікам айчыннага бардаўскага руху. Гэты статус і быў пацверджаны К. Герашчанкам падчас прэзентацыі. Слухачы вельмі прыхільна прымалі яго творы, асабліва драматычную па сваіму сэнсаваму напаўненню песню на верш Анатоля Сыса «У гэтай краіне». Настальгічныя ноты журбы па ладнаму вясковаму жыццю прагучалі ў наступнай кампазіцыі Кастуся — «Студня», якую бард стварыў на верш З. Марозава.

Услед за Герашчанкам творчасць рэгіянальных аўтараў прадставіў слухачам яшчэ адзін цікавы выканаўца з Залесся — Сяргей Верамейчык. Яго творы — гэта разгорнутыя малюнкі жыцця беларускай глыбінкі, напоўненыя незлаблівай сатырай і тонкім гумарам, меладычнай лёгкасцю і пазітыўным поглядам на мясцовыя жыццёвыя калізіі. «Байка», напрыклад, распавядаецца ад асоб тых жывёл, якія пасвяцца на палетках князя Агінскага, а гумарыстычная балада «Да нядзелькі» — своеасаблівая аповесць пра акалічнасці жыцця беларускай правінцыі «ад панядзелка да нядзелькі», дзе ёсць усё: праца ў будні, весялосць, скокі і сон з гальштукам у салаце па выходных...

Як заўсёды, шчырыя апладысменты слухачоў выклікала спеўная творчасць чароўнай і вытанчанай Таццяны Беланогай. Яна падрыхтавала сваім прыхільнікам сюрпрыз: песні са свайго новага альбома, які будзе называцца «Ніткі». Спевы Таццяны Беланогай «Звычайнае каханне» і «Зіма. Вакзал» былі напоўнены непадробнай душэўнасцю і жаноцкасцю, меладызмам і лірычным хараством. Выступленне Таццяны засведчыла, што выканаўца знаходзіцца ў добрай творчай форме, стварае песні і выконвае іх з вялікім натхненнем і задавальненнем — і для сябе, і для сваіх слухачоў.

Аляксандр Вашчанка вядомы тым, што ажыццявіў пераклад «Грунвальдскай бітвы» з «Гісторыі Польшчы» Яна Длугаша, які друкуецца ў «Маладосці». Грунвальдская тэма моцна прагучала і ў аўтарскіх песнях настаўніка і перакладчыка. Кампазіцыя «Грунвальд» Вашчанкі стала напамінам пра хуткае 600-годдзе вялікай бітвы, пра тое, што нашчадкі павінны памятаць мужнасць тых ваяроў, якія аддалі сваё жыццё за незалежнасць Бацькаўшчыны...

Арганізатары прэзентацыі дыска «Барды Свабоды» надалі асаблівую ўвагу песеннай творчасці маладых выканаўцаў. І гэта зразумела: менавіта маладым належыць будучыня нацыянальнага бардаўскага руху! І на прэзентацыі была засяроджана ўвага на асобах маладых аўтараў. Сярод іх Раман Яраш, які пераўвасабляе паэзію Уладзіміра Караткевіча. І хоць радкі класіка вымагаюць больш эмацыянальнага і экспрэсіўнага прачытання, павольна-распеўная манера выкання Рамана часам дазваляе па-новаму асэнсаваць знаёмыя творы любімага аўтара.

Яшчэ адна прыхільніца Уладзіміра Караткевіча — Кацярына Ваданосава прадэманстравала выдатныя кампазітарскія здольнасці, калі ўзялася стварыць песню-фантазію паводле аповесці «Дзікае паляванне караля Стаха». Гэты спеў прывёў у захапленне слухачоў, выклікаў шквал апладысментаў. Ад сябе дадам: калі б узнікла ідэя стварэння музычнага прысвячэння Караткевічу, то творы Р. Яраша і К. Ваданосавай былі б на ім вельмі да месца.

Своеасаблівым адкрыццём прэзентацыі «Барды Свабоды» варта прызнаць выступ студэнткі Беларускай акадэміі музыкі Ірыны Лой, якая прапанавала слухачам сваю музычную інтэрпрэтацыю «Сымона-музыкі» Якуба Коласа, а таксама варыяцыі на тэму вершаў Максіма Багдановіча. Слухачоў захапіў гожы, правільна пастаўлены голас спявачкі, які вельмі пасуе класічным паэтычным радкам, іх беражлівае інтанаванне.

Вядома, што стваральнікі праграмы «Барды Свабоды» абвясцілі конкурс сярод маладых аўтараў «Гітара Свабоды», які быў прысвечаны свабодзе ва ўсіх яе праявах. Пераможцаў чакалі каштоўныя прызы — акустычныя гітары. Сярод узнагароджаных — Марыя Новікава, Дар'я Кадамская, вакаліст гурта «Босае сонца» Алесь Зайцаў, Раман Яраш і іншыя аўтары. Іх песні засведчылі: новая генерацыя беларускіх выканаўцаў ужо ў кроку ад бардаўскага Алімпу. І таму ў хуткім часе нас чакаюць нечаканыя музычныя адкрыцці, новыя шчырыя і запамінальныя песні. Прынамсі, надзею на гэта выказалі арганізатары праекта «Барды Свабоды».

СПРАВАЗДАЧА

# «ДОМА — БЕЛАРУСКАЕ ПАВЕТРА»

Аляксандр ТАМКОВІЧ

**«Дома — беларускае паветра», — менавіта гэта фраза прагучала з вуснаў аднаго з вучняў у адказ на просьбу вядомага пісьменніка Уладзіміра Арлова назваць пяць рэчаў у доме, якія дапамагаюць адчуваць сябе беларусамі. І яна даволі красамоўна адлюстроўвае тое, што цягам апошняга часу адбывалася ў межах агульнанацыянальнай грамадскай культурніцкая кампаніі «Будзьма беларусамі!»**

Нагадаем, створана «Будзьма!» была 1 кастрычніка 2008 года. А заснавальнікамі сталі 10 вядомых у нашай краіне (і не толькі) арганізацый. Не жадаю нікога пакрыўдзіць, але, думаю, яны цалкам пагодзяцца з тым, што самым актыўным лакаматывам усёй справы стала Згуртаванне беларусаў свету «Бацькаўшчына».

Таму слова кіраўніку гэтай структуры і адной каардынатараў кампаніі «Будзьма!» Алене Макоўскай: «Наша першасная задача была ў тым, каб аб'яднаць беларусацэнтрычных людзей для супольнага дзеяння — правядзення разнастайных культурных мерапрыемстваў: канцэртаў, літаратурных імпрэзаў, мастацкіх выставаў. Наступны этап, на які мы выходзім, — пашырэнне. Мяркую, у нас гэта атрымліваецца — значная колькасць людзей, якая знаходзілася па-за межамі беларускай культурнай прасторы, стала яе часткай».

Не вельмі люблю нешта пералічваць, бо гэта заўсёды падобна да нейкай бюракратыі, але цытаты з афіцыйнага прэс-рэлізу тут цалкам абгрунтаваныя. Дык вось: «За паўтара года ў межах кампаніі «Будзьма!» адбылося 1138 разнастайных мерапрыемстваў, у якіх бралі ўдзел 91 360 чалавек у 188 розных населеных пунктах (гарады, пасёлкі, вёскі). 86 працэнтаў мерапрыемстваў адбывалася на дзяржаўных пляцоўках: бібліятэках, музеях, навучальных установах, дамах культуры і інш.»

Назваць кожнага ўдзельніка гэтых імпрэзаў, зразумела, немагчыма, таму яшчэ раз цытую: «У іх узялі ўдзел такія вядомыя выканаўцы, як Лявон Вольскі, Зміцер Вайцюшкевіч, «Drum Ecstasy», «Neuro Dubel» і інш. Пабачылі свет спецыяльныя і супольныя праекты: «Тузін. Перазагрузка», «Budzma the best folk», «Budzma the best rock», дыск Алеся Камоцкага «З бацькоўскай кружэлкі», «Дрыгула» гурту «Стары Ольса», альбом «Мой сябра анёлак», дыск «Rock'n'Troll» гурту «Litvintroll», праект Глеба Лабадзенкі «Галасы», праект Лявона Вольскага «Белая яблыня грому» ды інш.»

Асобна хацелася сказаць пра сайт www.budzma.org, які завецца «Будзьма разам!». І тут зноў цытата: «У сярэднім сайт мае 15–17 тысяч унікальных наведванняў цягам месяца. Згодна з даследаваннем кампаніі «gemiusAudience», аўдыторыя сайта www.budzma.org выглядае наступным чынам: 45% — мужчыны, 55% — жанчыны. Палова наведнікаў маюць узрост 15–24 гады, чвэрць — 25–34, 15% — 45–54 гады, рэшта — іншыя ўзросты. Геаграфія наведнікаў: у сярэднім 80% з Беларусі, з іх крыху больш за палову з Мінска, з рэгіёнаў на першым месцы Віцебская вобласць — кожны пяты наведнік».

Але ўсё гэта, як кажуць, справы мінулых дзён, бо пачынаючы з сённяшняга ў «Будзьмы» шмат новага. І не толькі афіцыйны лагатып, які сведчыць пра рост папуляцыі «будзьмістаў», бо побач з фігуркамі мужчыны і жанчыны з'явілася фігурка дзіцяці. Амаль цалкам змяняюцца падыходы да працы, метады вядзення кампаніі і фармавання партнёрскіх дачыненняў. Будзе зроблены акцэнт не на колькасці, а на якасці мерапрыемстваў. Перавага аддаецца тым праектам, якія маюць патэнцыял стаць папулярнымі сярод значнай колькасці нашых суграмадзян.

Яшчэ адна з каардынатараў кампаніі «Будзьма!» Ніна Шыдлоўская адзначыла іх так: «У 2010 годзе ўдзельнікі кампаніі будуць не толькі рэалізоўваць ідэі іншых, але і актыўна ініцыяваць і здзяйсняць уласныя. Для нас самае галоўнае — распаўсюд ідэй («Будзьма адметнымі!», «Будзьма беларусамі! 100% якасная культура!», «Будзьма беларусамі! Мода, якая застанецца!», «Будзьма беларусамі! Вярэм з мінулага лепшае!» і інш.), якія выклікаюць у чалавека жаданне праявіць ініцыятыву».

І апошняе. Каб вытрымаць «гендэрны баланс» і абвергнуць тое, што «ўсім там кіруюць жанчыны», назавем яшчэ двух вядомых каардынатараў кампаніі «Будзьма!» — Ігар Лялькоў і Севярын Квяткоўскі.

Дадаць да гэтай пачэснай кампаніі можна яшчэ шмат каго, але галоўнае — не ў гучных прозвішчах, а ў тым, што дзеці пачалі адчуваць у сваіх дамах «беларускае паветра».

ФЕЛЬЕТОН

# ХУТЧЭЙ, ВЫШЭЙ, СТАБІЛЬНЕЙ

Алег НОВІКАЎ

**Нельга не вітаць ідэю супрацоўніка адміністрацыі Наталлі, якая, падводзячы сумныя вынікі дасягненняў беларускай алімпійскай зборнай у Ванкуверы, прапанавала арганізаваць айчынны спорт па армейскаму прынцыпу.**



***

Кабінет спарткома быў заняты. Прызыўніку не заставалася нічога іншага, як вывучаць плакат «Не — допінгу ў беларускім войску!», які вісеў у калідоры. Тэкст плаката распавядаў пра сумны лёс аднаго генерала, якога злавілі на ўжыванні допінгу падчас расійска-беларускіх вучэнняў «Захад–2». Падпарадкаваныя генералу часткі рухаліся і калашмацілі імправізаванага натаўскага праціўніка занадта хутка, што выклікала лагічнае падазрэнне сярод сяброў антыдопінгавага камітэту Мінабаронспорту.

Нарэшце спартком вызваліўся і паклікаў юнака:

— Хто там — заходзь.

Прызыўнік апынуўся ў невялікім пакоі. За сталом — ён займаў дамінуючую частку прасторы — сядзеў немалады мужчына ў форменных афіцэрскіх трэніках і вязанай шапцы капітана. Ён капаўся ў шуфлядцы.

— Прозвішча? — спытаў гаспадар, не падымаючы галавы.

— Алег Мыла.

Нечакана на свет з'явіўся аркуш паперы. Спартком пару хвілін вывучаў яго, перад тым як абвесціць:

— Магу вас павіншаваць. Вы прыгодныя для службы.

Прызыўнік — тыповы студэнтбатанік — паглядзеў на суразмоўцу як на вар'ята.

— Што?

— Тое, што чуў. Віншую, вы прыгодныя да праходжання службы ў беларускай алімпійскай зборнай.

Хлопец яўна не чакаў такога павароту.

— Як жа так?! У мяне ж зрок… Гэта сапраўдная палітычная замова! Прымусовы алімпійскі прызыў! Спачатку вы звальняеце мяне з ВНУ па фармальных прычынах… Пасля я атрымліваю павестку ў спарткамат! А цяпер яшчэ жадаеце забрыць мяне на стадыён! І ўсё толькі таму, што я сябра Маладога Фронту!!! Такім чынам вы распраўляецеся з апазіцыянерамі?! За нашу актыўную палітычную пазіцыю вы размяркоўваеце палітычна незадаволеных у спартсмены?!

Спарткома не кранула падобная аргументацыя.

— Малады чалавек… Як вас там, Алег Мыла. Палітыка тут не прычым. Усе мужчыны і жанчыны ў выпадку, калі яны маюць спартовыя таленты, павінны праходзіць службу, падобную на вайсковую, у шэрагах спартовай нацыянальнай дружыны. Менавіта такі прынцып за словамі галоўнага ідэолага краіны гарантуе нам у Сочы мех алімпійскіх медалёў. Вы цалкам пасуеце крытэрыям алімпійца, сябра зборнай па фігурнаму катанню ў парным разрадзе.

— Якому фігурнаму катанню?!

— Ну, фігурнае катанне, від спорту такі. Усякія піруэты на лёдзе. Зайздрошчу я вам, па шчырасці. Я таксама калісьці хацеў катацца, як той Зайцаў або Радніна.

Гэтыя прозвішчы нічога не казалі прадстаўніку новай генерацыі.

— Які ж з мяне фігурыст? Я нават на каньках не стаю.

— Навучаць. Для гэтага і існуе вучэбка ў Печах. Цяжка ў вучэнні, лёгка на лёдзе. Хутка будзеце з заплюшчанымі вачыма завязваць і развязваць канькі. Паверце: праз гадкоў дзесяць я яшчэ пабачу вас у парку Горкага ў дзень фігурыста, калі вы будзеце піць гарэлку і дапытваць мінакоў пытаннем кшталту: а ты можаш двайны тулуп скакаць?

— Слухайце. Я ўсё роўна не прыпыню сваю палітычную дзейнасць. Я пачну пісаць у ЖЖ праўду пра зборную. Я буду патрабаваць, каб мне трэнеры аддавалі загады па-беларуску. Гэта мае канстытуцыйнае права. Я буду падпісвацца на незалежную прэсу.

Хлопец, гучна стукнуўшы дзвярыма, сышоў.

***

Гэты гучны і непрыемны стук дзвярэй прымусіў падскочыць двух людзей у адным з кабінетаў таго ж будынку. Раздражняльны гук ішоў з дынаміка маленькага мікрафона, які трансляваў апісаную вышэй размову. Пісаў дыялог, відавочна, схаваны жучок у кабінеце спарткома.

— Ну што думаеце, калега? — спытаў адзін з гэтых людзей.

Другі запаліў цыгарэту.

— Тыповы выпадак ужывання допінгу. Ты чуеш тэмбр яго голасу? Гэты спартком даўно і шчыльна сядзіць на анаболіках. Падазраю, што ў дадатак нюхае гарманальныя стэроіды.

— Маеш рацыю. Ну што, бяры мензурку — і пабеглі.

Сябры антыдопінгавага камітэта Мінабароны (як вы здагадаліся, гэта былі яны) падарваліся і пабеглі браць у спарткома аналіз мачы.

***

Пакуль камітэтчыкі беглі з аднаго крыла будынку іншы, спартком узяў мабільнік:

— Алё, мне патрэбны галоўнакамандуючы федэрацыі фігурнага катання. Алё, ну вітаю: гэта Кузкін. Ну ўсё, аформіў я гэтага Івана Мылу да цябе ў зборную, як ты і прасіў. Хлопец што трэба: апазіцыянер самы што ні ёсць жалезабетонны: зробіць тваёй часціцы славу на ўсю краіну. Так што даю гарантыю — пасля Сочы з цябе будзе як з гусака вада. «Якія медалі, — скажаш, калі на дыван выклікаюць, — мы тут зранку да вечара апазіцыю перавыхоўваем. Палітычная стабільнасць і ўсё такое». Ну, бывай. Дарэчы, ты чуў, што вярхоўны камандуючы асабіста прыязджае на вучэнні па 64-клетачных шашках і што Колі... Прабач, да мяне прыйшлі. Хто вы? Што вы робіце. Я не хачу ў туалет. За што?

На гэтым тэлефонная размова перарвалася.

Новы Час
Масава-палітычная газета
Выдаецца з сакавіка 2002 г.
Галоўны рэдактар
Аляксей Кароль

Пасведчанне аб рэгістрацыі № 206 ад 20 ліпеня 2009.
ЗАСНАВАЛЬНІК: Мінская гарадская арганізацыя ГА ТБМ імя Ф.Скарыны. Адрас: 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13. Тэл.: 284–85–11.
ВЫДАВЕЦ: Прыватнае выдавецкае унітарнае прадпрыемства «Час навінаў».

Пасведчанне №64 ад 12.01.2007 г.
АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАЎЦА:
220012, г. Мінск, зав. Інструментальны, 6-214.
Тэл.: +375 29 651 21 12, +375 17 280 17 91.
novychas@gmail.com; www.novychas.org
НАДРУКАВАНА ў друкарні УП «Плутас-Маркет». Мінск, вул. Халмагорская, 59 А.

Замова № 334
Падпісана да друку 16.04.2010. 8.00.
Наклад 6000 асобнікаў. Кошт свабодны.
Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы іх пазіцыі аўтараў.
Пры выкарыстанні матэрыялаў газеты спасылка на «Новы Час» абавязковая.
Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе мастацкія творы.
Чытацкая пошта публікуецца паводле рэдакцыйных меркаванняў.